Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КРАСАВІК 24 1933 г.
№ 90 (4634)
Год выданьня XVI

Да 15-годзьдзя манаполіі замежнага гандлю — **Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!**

РАБОТНІКАМ СЫСТЭМЫ ЗАМЕЖНАГА ГАНДЛЮ СССР

У дзень 15-годзьдзя манаполіі замежнага гандлю СССР ЦК УсеКП(б) і Саўнарком СССР горача вітаюць работнікаў сыстэмы Наркамату замежнага гандлю. Створаная пад кіраўніцтвам т. Леніна манаполія замежнага гандлю СССР была і застаецца адным з самых магутных сродкаў будаўніцтва сацыялізму, непахіснай асновай савецкай гаспадаркі. Задачы, пастаўленыя перад манаполіяй замежнага гандлю—садзейнічаньне справе індустрыялізацыі Саюзу і сацыялістычнай перабудове вёскі і абарона краіны будаўніцтва сацыялізму ад капіталістычнага акружэньня—працоўныя СССР і работнікі сыстэмы Наркамату замежнага гандлю выканалі і выканаюць з гонарам. ЦК УсеКП(б) і Саўнарком СССР заклікаюць работнікаў сыстэмы Наркамату замежнага гандлю цьвёрда стаяць на варце непахіснасьці манаполіі замежнага гандлю, берагчы валютныя рэсурсы краіны, выкарыстоўваючы іх найбольш рацыянальна ў інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦК УсеКП(б).
СНК СССР.

ПЕРАШМАЙСКІЯ ЛЁЗУНГІ ЛЕНІНСКАГА ЦК—У МАСЫ!

Міжнароднае значэньне нашага гаспадарчага будаўніцтва вялізарнае. Гэта праходзіць чырвонай ніткай праз тыя, надрукаваныя ўчора ў «Праўдзе» лёзунгі ЦК УсеКП(б) да 1-га мая 1933 году. Гэта пацьвярджаецца сотнямі фактаў. Мацнее Савецкі саюз, расьце яго гаспадарка, і ўсё новыя і новыя людзі з буржуазнага лягеру пераходзяць на бок прыяцеляў СССР.

Але рост і ўмацаваньне СССР адначасова актывізуе другі лягер—лягер людзей, якія гараць зоапёгічнай нянавісьцю да краіны дыктатуры пралетарыяту. На чале гэтага лягеру стаяць цьвёрдалобыя рабаўласьнікі Англіі. Яны арганізуюць адзіны фронт імпэрыялістаў для нападу на СССР. Першы крок гэтага нападу—забарона ўвозу савецкіх тавараў у Англію. Першая інтэрвэнцыя іх, відавочна, нічому не навучыла. Яны ўсё яшчэ думаюць, што мы і яны знаходзімся ў такім-жа прыкладна становішчы, як 10 год таму назад, у часе ноты Керзона. Глыбокая памылка! Гаспадарчая магутнасьць Англіі ішла нязьменна па нахіленай роўніцы, а гаспадарчая, палітычная і ваенная магутнасьць СССР расла і мацавалася нячуванымі ў сьвеце маштабамі. САВЕЦКІ САЮЗ—ВЯЛІКАЯ НЕЗАЛЕЖНАЯ КРАІНА. Пралетары і калгасьнікі, наша гераічная Чырвоная армія, атрымаўшая магутную тэхніку, добра памятае словы свайго правадыра тав. СТАЛІНА: «ні аднэй пядзі чужой зямлі ня хочам, але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому».

Сусьветны эканамічны крызіс усё мацней і мацней зацягвае пятлю на шыі капіталізму. А ў гэты час побач, у СССР — бурны рост народнай гаспадаркі.

Параўнаньне двух сьветаў, дзьвёх сыстэм гаспадаркі ня можа ня выклікаць гарачых сымпатый пралетараў і працоўных капіталістычных краін да краіны Саветаў.

Першамайскае сьвята—балвы інтэрнацыянальны агляд сіл пралетарыяту. Першага мая мерны поступ згуртаваных радоў пралетараў і працоўных пачуецца на вуліцах капіталістычных гарадоў, ня гледзячы на шалёны тэрор. Германскія фашысты і іх пёкаі, прабуючы ашукаць масы і вытруціць рэвалюцыйны, інтэрнацыянальны зьмест першамайскага сьвята, абвясьцілі першае мая «нацыянальным сьвятам». Марныя патугі. Рабочая кляса Германіі, кроўна зьвязаная са сваёй гераічнай кампартыяй, застанецца пад сьцягамі Камінтэрну.

Першае мая пралетары, калгасьнікі, перадавыя аднаасобнікі, сумленныя савецкія спэцыялісты, усе працоўныя вялікага Савецкага саюзу сустрэнуць новымі перамогамі на фронце гаспадарчага будаўніцтва, новым уздымам творчай энэргіі. АСНОЎНЫ ЛЁЗУНГ ЦК УсеКП(б) ДА ПЕРШАГА МАЯ 1933 ГОДУ—ВЫКАНАЦЬ ПРАМФІНПЛЯН, АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ, ПАВЫСІЦЬ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ, ЗНІЗІЦЬ САБЕКОШТ, УСТАНАВІЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ДЫСЦЫПЛІНУ ПРАЦЫ, СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЦЬ ПАЛІ, ДАБІЦЦА ВЫСОКАГА УРАДЖАЮ! Пад гэтым лёзунгам павін на весьціся ўся падрыхтоўка да 1 мая і 4-ай гадавіны сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Пралетары, калгасьнікі, перадавыя аднаасобнікі! Памятайце, што кожная тона чыгуну, сталі, вугалю, нафты, кожны мэтр мануфактуры, кожны га засеяннай плошчы—балвы знарад, які ўзрывае стары сьвет, умацоўвае абароназдольнасьць нашай краіны, паляпшае становішча працоўных, дапамагае сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ І ПАСЬПЯХОВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ—ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА. На вырашэньне яе неабходна мабілізаваць усю волю, усю энэргію, усе сілы нашай краіны.

Першая пяцігодка высунула тысячы актывістаў новага будаўніцтва. У пафасе будаўніцтва яна пераплавіла вялізарныя пласты чалавечага матэрыялу, выкавала многія тысячы актыўных, сьвядомых будаўнікоў сацыялізму, імёны герояў працоўнага фронту, якія пабудавалі Магнітагорскі і Кузьнецкі мэталюргічныя заводы, Сталінградзкі і Харкаўскі трактарныя заводы, Дняпроўскую гідра-электрастанцыю і сотні іншых індустрыяльных гігантаў, імёны людзей, пабудаваўшых савецкія дырыжыблі, генэратары, караблі і самалёты, праклаўшых упяршыню ў гісторыі чалавецтва шляхі сярод вечных ільдоў, —імёны гэтых герояў ведае ўся краіна. Новая абстаноўка настойліва вымагае выпучэньня новых герояў працоўнага фронту, ГЕРОЯЎ АЎЛАДАНЬНЯ СУЧАСНАЙ ТЭХНІКАЙ, СТВОРАНАЙ У ПЕРШАЙ ПЯЦІГОДЦЫ. На гэтым вучастку мы адстаем, і невыпадкова, напрыклад, у Данбасе, лепшым героям працоўнага фронту зьяўляецца РУЧНЫ ЗАБОЙШЧЫК Мікіта Ізотаў.

Але партыя і ўрад выдаткавалі вялізарныя сродкі на мэханізацыю Данбасу, каб палегчыць працу вуглякопа, каб максымальна паскорыць здабычу чорнага золата. ВУГОЛЬНЫ ДАНБАС ПАВІНЕН ВЫСУНУЦЬ ПОБАЧ З ІЗОТАВЫМІ, ПРАЦУЮЧЫМІ АБУШКОМ, ТЫ СЯЧЫ ІЗОТАВЫХ МЭХАНІЗАВАНАЙ ЗДАБЫЧЫ ВУГАЛЮ, БО ЗАРАЗ ЛЁС ВУГЛЯЗДАБЫЧЫ ВЫРАШАЮЦЬ МЭХАНІЗМЫ, УМЕНЬНЕ ІХ ВЫКАРЫСТАЦЬ!

Герої аўладаньня новай тэхнікай ужо ёсьць, але мы мала папулярызуем іх вопыт. Мы часта забываем указаньні Ўл. І. Леніна аб гіганцкай сіле прыкладу, аб неабходнасьці практычнага ўжываньня ў масавым маштабе вопыту перадавікоў. У гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва, у першамайскія дні ўзьнімем на шчыт герояў асваеньня новай тэхнікі! Паднімем на шчыт перадавых ударнікаў, герояў барацьбы з бракам, герояў павышэньня прадукцыйнасьці працы, зьніжэньня сабекошту, герояў барацьбы з подырамі і прагульшчыкамі. Зробім іх імёны паважанымі, шаноўнымі, любімымі ў нашай краіне, іх вопытам узброім мільённыя масы пралетараў і калгасьнікаў.

Першамайскае сьвята і гадавіна сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва павінны быць максымальна скарыстаны для перанясеньня лепшага вопыту гарадзкіх прамысловых прадпрыемстваў у саўгасы і калгасы для яшчэ большага разгортваньня сацспаборніцтва на палёх. Тав. Сталін паставіў задачу—падняць «усіх калгасьнікаў, і былых беднякоў, і былых сераднякоў, да ўзроўню заможных, да ўзроўню людзей, якія карыстаюцца багацьцем прадуктаў і вядуць зусім культурнае жыцьцё». Сумленная работа на калгасных палёх, пільны догляд рабочай жывёлы і машыны, ачыстка калгасаў ад антысавецкіх элемэнтаў, барацьба з подырамі і ўстанаўленьне жалезнай працоўнай дысцыпліны—шляхі ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. Сталіна.

Вялізарнымі дасягненьнямі сустракае краіна Саветаў першамайскае сьвята і гадавіну сацыялістычнага спаборніцтва. Але яшчэ большыя задачы стаяць перад намі. Вырашыць іх мы зможам толькі ў тым выпадку, калі па-бальшавіцку возьмемся за справу, калі дасягненьні гэтых перадавых заводаў, саўгасаў і калгасаў зробім здабыткам усіх, калі ўзмоцнім пралетарскую рэвалюцыйную пільнасьць, будзем весьці бязьлітасную барацьбу з двурушнікамі. У красавіку 1918 году Ўл. І. Ленін гаварыў аб перадавых рабочых: «яны схапілі (зразумелі—РЭД.) сутнасьць сацыялізму лепш за тых, хто кідаўся рэвалюцыйнымі фразамі, а на справе, сьвядома ці несьвядома, апускаўся на ўзровень дробнай буржуазіі». Гэтыя словы жывы і ў цяперашні момант! Герояў рэвалюцыйнай фразы, ахвотна галасуючых за плян, але на справе робячых, і зусім сьвядома, усё для зрыву пляну, у нас яшчэ ня мала. І ня выкрыўшы іх, не ачысьціўшы партыю ад усіх няўстойлівых, ненадзейных, чужых, прымазаўшыхся элемэнтаў, ня выгнаўшы з партыі здрадніка ў, жулікаў, ня ўзброіўшы кожнага члена партыі тэорыяй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, мы ня выканаем усіх тых вялізарных задач, якія стаяць перад намі.

Выступленьнямі серпамолатаўцаў і мартаўцаў пачалася першамайская пераклічка заводаў і палёў. Перадавікі, раскажце аб тым, як вы змагаецеся за ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна! Адстаўшыя падцягнецеся і гэтым вы завоюеце права ісьці на першамайскіх дэманстрацыях з гонарам у радох перадавікоў.

Зробім першамайскія лёзунгі ЦК здабыткам мільённых мас рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных.

ПАД СЬЦЯГАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ТАВ. СТАЛІНА —НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ!

(Перадаевы артыкул «Праўды», перададны па радыё).

Адзначым падрыхтоўку першамайскага сьвята шырокім разгортваньнем сацспаборніцтва на палех

ЗАСЕЯНА ПА БССР НА 20 КРАСАВІКА У ГЭКТАРАХ

	ПА БССР	САУГАСЫ	КАЛГАСЫ	АДНААСОБ.
1933 год	27.690	601	19.353	6.969
1932 год	6.135	365	2.936	2.834

На 20 красавіка БССР засеяла 27.690 гэктараў—1 проц. пляну.

Саўгасы засеялі 601 гэктар, калгасы —19.353 га і аднаасобнікі—6.969 га. Параўнальна з мінулым годам ЗАСЕЯНА АМАЛЬ У 5 РАЗ БОЛЬШ.

У 1932 годзе на 20 красавіка па БССР было засеяна 6.135 гэктараў. Тэмпы, такім чынам, значна павялічыліся. Гэта вынік арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ачысткі іх ад клясава-варожых элемэнтаў, вынік росту актыўнасьці калгасных мас.

Аднак, ці можам мы прызнаць тэмпы сяўбы здавальняючымі? НЕ, НІ У ЯКІМ РАЗЕ.

Паўднёвыя раёны БССР пачалі ворыва, баранаваньне і сяўбу ў першых пічах красавіка. За тры тыдні яны засеялі пад яравыя толькі 25.000 гэктараў—3 проц. пляну. Да 25 красавіка раёны паўднёвай зоны павінны засеяць 155.000 гэктараў аўса, засеяна-ж 11.320 га. Лічбы трывожныя. Яны сыгналізуюць аб недапушчальным зацягваньні сяўбы яравых і, асабліва, аўса.

Такія паўднёвыя раёны, як Бабруйскі, Стара-Дароскі і інш., яшчэ нават не пачынялі сеяць аўса. Чырвонапольскі, Чырвона-Слабодзкі, Кармянскі, Уваравіцкі, Буда-Кашалёўскі, Рагачоўскі і Любаньскі раёны засеялі ўсяго ад 2 да 50 гэктараў аўса—0,2, 0,6 проц. пляну. У цэнтральнай зоне 13 раёнаў таксама яшчэ не пачыналі сеяць аўса. Па ўсёй зоне засеяна толькі 727 гэктараў—0,3 проц. пляну.

Асабліва адстаюць саўгасы. Чаго варт хоць-бы той факт, што саўгасы магілёўскага сьвінаводтрэсту ўсяго засеялі 11 гэктараў—0,5 проц. і Гэта ў той час, калі да 25 красавіка плян сяўбы аўса павінен быць поўнасьцю выкананы.

Аб сур'ёзнейшым адставаньні сыгналізуюць і першыя вынікі сяўбы па аднаасобных гаспадарках.

У той час, як калгасы засеялі 19.353 гэктары, аднаасобнікі—толькі 6.969. Гэта —рэзультат ігнараваньня і недаацэнкі аднаасобнага сэктару ў цэлым радзе раёнаў. У Барысаўскім раёне многія аднаасобнікі яшчэ і зараз ня ведаюць, дзе ім сеяць (Зачынскі сельсавет). Справа гэта цягнецца яшчэ з мінулага году, аднак райзямаддзел ня прымае ніякіх мер.

У Мсьціслаўскім раёне аднаасобнікі яшчэ не пачыналі палявых работ. Да ад наасобных гаспадарак нават і цяпер не даведзены пасеўныя заданьні. Тут абмежаваліся толькі тым, што ўзялі ад аднаасобнікаў расьпіскі аб ссыпцы насенфондаў.

Закон аб абавязковай пастаўцы збожжа і іншых прадуктаў дзяржаве папулярызуецца невыстарчальна. У радзе раёнаў (Мсьціслаўскім, Жытковіцкім, Тураўскім і г. д.) зусім слаба вядзецца барацьба з кулацкім сабатажам.

Жалезны адпор дэмабілізацыйным, самацёчным настроям. Жалезны адпор ігнараваньню аднаасобніка—нашага заўтрашняга калгасьніка!

Далейшая марудносьць з сяўбой—злачынства.

Дзесяткі перадавых калгасаў нашай рэспублікі ўжо цапкам, да аднаго гэктара засеялі ранныя яравыя культуры. Іх посьпех—сакрушальны ўдар па тых гора-работніках, якія імкнуцца апраўдаць зацягваньне сяўбы спасылапаньнямі на надвор'е і іншымі «аб'ектыўнымі» прычынамі.

Па-бальшавіцку ўмацуем дысцыпліну на палёх саўгасаў і калгасаў, забясьпечым свячасовае правядзеньне сяўбы па кожнай працоўнай аднаасобнай гаспадарцы!

Мацней удар па кулаку і яго агентах, сабатажніках веснавой сяўбы!

Сустрэнем дзень першага мая рашаючай перамогай у барацьбе за тэмпы і якасьць сяўбы другой сацыялістычнай пяцігодкі!

ГОМЕЛЬ

АВЁС ЗАСЯВАЕЦЦА ПА АЎСУ

ПАД СУД ЗА ПАДРЫЎ УРАДЖАЙНАСЬЦІ

0,56, 0,02, 0,34, 0,6 — гэта лічбы выкананьня пляну сяўбы яравых амаль па ўсіх сельсаветах раёну. Толькі адзін Прыбыткаўскі сельсавет дабіўся некаторага, хоць і зусім нездавальняючага, зруху — 10,14 проц. пляну.

На 20 красавіка Гомельскі раён выканаў плян сяўбы яравых усяго ў разьмерах 2,89 проц. Сяўба ідзе абломаўскімі тэмпамі.

Яшчэ горш з якасьцю. У цэлым радзе калгасаў і саўгасаў ворыва і сяўба праводзяцца злачынна. Факт з калгасам «Чырвоны герой», дзе былі шкодніцка зьменшаны нормы высеву і сяўба праведзена так, што насеньне нават ня прыкрыта зямлёй, не паслужыў патрэбным урокам.

У калгасе «Чырвонагвардзеец» таксама зьменшаны нормы высеву. Рэшта насенфондаў раскрадзена. У калгасе «Чырвоны маяк» усё ўзаранае поле ў агрохах. Сяўба праводзіцца ў адновар. Гэта — справа кулацкіх рук. Калгас засьмечан клясава-варожымі элемэнтамі, якія імкнуцца дрэннай апрацоўкай глебы сарваць веснавую сяўбу.

У гомельскім канягадоўчым саўгасе сеюць яравыя на тых самых землях, на якіх гэтыя культуры былі засеяны і ў мінулым годзе. Увесь авёс, напрыклад, засяваецца на аўсянішчы. Даволі ўказаць, што толькі ў аддзяленьні «Маяк» засяваюць 300 гэктараў аўса корань па корань. Палі саўгасу ў агрохах. Сяўба праводзіцца з вялікімі пропускамі. Віку ў саўгасе сеюць у аднавор.

Гарком КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове кваліфікаваў усе гэтыя факты, як «праўдзіўленьне кулацкага шкодніцтва, накіраванага на зрыў веснавой сяўбы».

Вінаватыя ў злачынна-шкодніцкай апрацоўцы глебы аддаюцца пад суд.

П.

БЯГОМЛЬ

У ГРАФЕ... НУЛЬ

У зводны бягомльскага райзямаддзелу аб ходзе сяўбы ў графе «аднаасобны сэктар» стаіць нуль.

На 20 красавіка раён выканаў плян сяўбы толькі на 1,4 проц. Сяўба ідзе толькі па саўгасах і калгасах. Аднаасобнікі ў раёне яшчэ фактычна не засеялі ні аднаго гэктара. Толькі ў адным сельсавеце аднаасобныя гаспадаркі прыступаюць да сяўбы.

Усе гэтыя факты—вынік злачыннага ігнараваньня працоўных аднаасобнікаў у раёне. Яшчэ і зараз каля 100 працоўных аднаасобных гаспадарак Мсьціскага, Бягомльскага і іншых сельсаветаў не атрымалі зямлі. У выніку плян ворыва па аднаасобным сэктары выканан усяго на 5 проц. Аднаасобнікі Мсьціскага сельсавету яшчэ не ўзаралі ні аднаго гэктара. Старшыня сельсавету Рудкоўскі разам з парт'ячэйкай толькі прымаюць рэзалюцыі, груба ігнаруючы аднаасобныя гаспадаркі. Адвод зямлі для працоўных аднаасобнікаў ня скончан і цяпер.

Масавая работа і, асабліва, па папулярызацыі закону пра абавязковую на стаўку збожжа і інш. с.-г. прадуктаў дзяржаве, у раёне зусім не разгорнута.

Чым усё-ж займаюцца райком, райвыканком і райзямаддзел?!

ЗАСЕЯНА АЎСА НА 20 КРАСАВІКА У ГЭКТАРАХ

ПА ЎСІХ СЭКТАРОХ	САЎГАСЫ	КАЛГАСЫ	АДНААСОБНІКІ
12.129	390	9.540	2.199
2,4 ПРОЦ. ПЛЯНУ			

ГАРАДОК

І У РАЙКОМЕ СТАЛА ЦІХА

15 красавіка было днём масавага разгортваньня палявых работ па БССР. Тэлеграма ЦК і СНК аб разгортваньні сяўбы асабліва аўса і ільну была атрымана і ў Гарадоцкім раёне.

Забегалі кіраўнікі райзямаддзелу, зашумелі ў райкоме і ў райвыканкоме. Адразу-ж была пасланa адпаведная пошта-тэлеграма ўсім сельсаветам. У тэлеграме былі ўказаны самыя дакладныя тэрміны сяўбы, колькі трэба засеяць аўса і ільну на 16, 17, 20 красавіка і г. д.

Назаўтра стала ціха ў райкоме і яшчэ цішэй у РВК. Пра сяўбу ніхто і не ўспамінаў. Ноччу выпаў сьняжок, які зусім супакоіў гарадоцкіх кіраўнікоў.

Раённы аграном Разанаў, наогул, адкрыта абвясьціў адтэрміноўку сяўбы:

— Пачакаем так, да 5 мая, а тады па бачым. Сьпяшаць няма чаго,—заяўляе Разанаў.

І сапраўды ў Гарадку не сьпяшаюцца. На 20 красавіка засеяна толькі 41 гэктар—0,1 проц. пляну.

ДОКТАРАЎ.

ПЕРШЫЯ УСХОДЫ

ЛЁЗЬНЯНСКАЯ І ВЕТРЫНСКАЯ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫЯ СТАНЦЫІ ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ ЗВЫШРАНЬНЯЙ СЯЎБЫ ІЛЬНУ. ЛЁЗЬНЯНСКАЯ МТС ЗАМЕСТ 60 ЗАСЕЯЛА 120 ГА ІЛЬНУ ЗВЫШРАНЬНІМ СПОСАБАМ. НА ПАЛЁХ ПААСОБНЫХ КАЛГАСАЎ ВЕТРЫНСКАЙ, ЛЁЗЬНЯНСКАЙ І СЕНЬНЕНСКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЙ ЗЬЯВІЛІСЯ ПЕРШЫЯ ЎСХОДЫ ЗВЫШРАНЬНЯГА ІЛЬНУ. УСХОДЫ ДОБРЫЯ.

РЭЧЫЦА

НЕ НА ПАЛЁХ, А Ў ГАБІНЭТАХ...

СЯЎБА ПА-РЭЧЫЦКУ

Дзьве лічбы: 6.400 і 279. Першая паказвае, колькі гэктараў аўса павінен засеяць Рэчыцкі раён да 25 красавіка, другая — колькі засеяна. На 20 красавіка раённы плян сяўбы аўса выканан толькі на 4,4 проц. Ганебнейшыя вынікі. І гэта ў паўднёвым раёне!

Прычыны?

Іх лепш за ўсё характарызуе наступная гутарка па тэлефону. У раённы цэнтр звоніць упаўнаважаны РК КП(б)Б і РВК па Маладуўскім сельсавеце т. ЧУДКОВА.

— Аль-лё, праводзім пленум сельсавету, засядаем ва ўсю. Сеяць нельга, чакаем надвор'я, ударна рыхтуемся...

Аналёгічныя паведамленьні паступаюць і ад іншых упаўнаважаных сельсавету. Людзі праводзяць пленумы, засядаюць, а на палёх — амаль пуста.

Аргумант з надвор'ем — ашуканства. Кліматычныя ўмовы цалкам спрыяюць масавай сяўбе. У наасобных калгасах — «Ударнік», «Перамога» і і г. д. — сяўба аўса і іншых яравых культур ідзе поўным ходам.

Вінавата не надвор'е. 4 проц. пляну —вынік апартуністычнай стаўкі на самацёк.

Па-ранейшаму ў раёне педапушчаль на ігнаруецца аднаасобнік. Яшчэ і на сёнешні дзень аднаасобным сэктарам нават не ссыпана поўнасьцю насеньне.

У тым самым Маладуўскім сельсавеце, дзе «засядаюць ва ўсю», на аднаасобных гаспадарках страхфонды ссыпаны ўсяго на 30 проц.

Д-ч.

СТАРОБІН

СЯЎБА ПУШЧАНА НА САМАЦЁК

КУЛАЦКІЯ ПАДПЯВАЛЫ У РОЛІ УПАУНАВАЖАНЫХ

Тэмпы палявых работ яўна ганебныя. Многія калгасы і сельсаветы дэмабілізаваліся і зацягваюць разгортваньне палявых работ. Пануюць самацёчныя настроі.

На 20 красавіка ў раёне засеяна толькі 1.268 га—5,1 проц.

— Сьпяшацца з сяўбой ня варта, пачакаем лепшага надвор'я—вось заявы, якія можна чуць ва многіх калгасах.

Паасобныя ўпаўнаважаныя РК і РВК падтрымліваюць гэтыя кулацкія настроі. Напрыклад, упаўнаважаны Пракапенка лічыць, што ў вёсцы па куль што... няма чаго рабіць. Ён кінуў сельсавет і прыехаў у Старобін.

Саўгас Пагост забясьпечан цягавай сілай. У саўгасе ёсьць 66 коняй і 4 трактары. І ўсё-ж саўгас засеяў толькі 11 га аўса з 255. Характэрна, што суседні калгас «Камунар», дзе цягавая сіла на 50 проц. слабейшая, здолеў засеяць 22 гэктары аўса. Саўгаснікі за апошнія 5 дзён не засеяў ні аднаго гэктара. Трыкутнік саўгасу злачынна зрывае сяўбу.

Ні адзін сабатажнік сяўбы ня прыцягнут да адказу.

РАГАЧОЎ

ЧАМУ УСЯГО 407

На 20 красавіка Рагачоўскі раён засеяў толькі 407 гэктараў аўса. А трэба да 25 красавіка засеяць 9.500. Калгасы засеялі ўсяго 284 га, аднаасобнікі—107. Многія калгасы—«Чырвоная армія», «Полымя», імя Сталіна, «Чырвоны партызан» і г. д. і на сёнешні дзень яшчэ не засеялі пад авёс ні аднаго гэктара.

Палявыя работы арганізаваны зусім нездавальняюча. Пастаянныя вытворчыя брыгады не ўмацаваны. Яскравай ілюстрацыяй можа служыць калгас «Чырвоны партызан», Старасельскага сельсавету, які асабліва зацягвае сяўбу аўса і іншых яравых культур.

У калгасе арганізаваны дзьве палеводчыя брыгады, але як? Зьвеньняў у брыгадах няма. Калгасьнікі ня ведаюць, што і дзе ім рабіць. Вытворчыя пляны да калгасьнікаў не даведзены. Палявыя работы ідуць усьляпую. Абязьлічка ліквідавана толькі ва паперы.

Ня дзіва, што «Чырвоны партызан» яшчэ не засеяў пад авёс ні аднаго га. Ня гледзячы на гэтыя трывожныя сыгналы, раённыя арганізацыі ня прымаюць, літаральна, ніякіх мер, каб умацаваць пастаянныя вытворчыя брыгады ў калгасах. Усё пушчана на самацёк.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

22-IV—33 г. адбыўся пленум гар. КК КП(б)Б. На пленуме разгледжаны арганізацыйныя пытаньні.

Пленум вызваліў тав. ЖОЛУДАВА ад абавязкаў старшыні гар. КК у сувязі з яго пераходам на іншую работу. Старшынёй гар. КК выбран тав. ХАДАСЕВІЧ П. І., сакратаром парткалегіі выбран тав. БЛОЎШТЭЙН.

У склад прэзыдыуму гар. КК уведзены т. т. БЛОЎШТЭЙН і КАРПЕНКА.

Пратэсты рабочых арганізацый Англіі супроць эмбарго

ЛЁНДАН, 22 (Белта). Рабочыя арганізацыі пачынаюць разгортваць кампанію пратэсту супроць эмбарго на ўвоз савецкіх тавара у Англію. Бедфордзкі прафсаюз аднагалосна прыняў рэзалюцыю, якая асуджае эмбарго і патрабуе заключэньня новага англа-савецкага гандлёвага дагавору. Выступаўшыя на пасяджэньні прафсавету прамоўцы падкрэсьлівалі, што працэс на справе служачых «Метра-Вікерс» вёўся добрасумленна. Сход лёнданскіх інструмэнтальшчыкаў прыняў рэзалюцыю, якая выражае рашучы пратэст супроць эмбарго, уведзенага ангельскім нацыянальным урадам. Рэзалюцыя вітае рабочых СССР і абяцае ўжыць усе меры для барацьбы супроць «урадавай палітыкі падрыхтоўкі да вайны».

Масавы мітынг рабочых швэйнай прамысловасьці Лёндане вынес таксама падобную рэзалюцыю.

Лёнданскі прафсавет прыняў рэзалюцыю, якая ганьбіць паводзіны ангельскага ўраду, як «грубую правакацыю». Рэзалюцыя патрабуе неадкладнага аднаўленьня перагавораў аб новым гандлёвым дагаворы.

Макданальд і Рузвэльт абмяркоўваюць праблемы сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі

Н'Ю-ЁРК, 22. (Белта). Прыбыўшы ў ПАЗШ брытанскі прэм'ер-міністр Макданальд заявіў прадстаўнікам друку, што ён спадзяецца абмеркаваць з Рузвэльтам шырокі круг палітычных і эканамічных пытаньняў, але ня думае заключаць якія небудзь канчатковыя дагаворы.

Пасьля перагавораў Рузвэльт і Макданальд апублікавалі сумеснае паведамленьне аб тым, што былі абмеркаваны асноўныя праблемы сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі і пастаноўлена перадаць гэтыя праблемы ў першую чаргу на разгляд экспэртаў.

ПАЗШ хочуць сарваць Оттаўскія згоды

ВАШЫНГТОН, 22. (Белта). Дзяржаўны дэпартамэнт даручыў амэрыканскім пасольствам указаць эўрапейскім урадам, што адыход ад залатога стандарту ня мае характару пагрозы па іх адрасе. Абстаўны, гаворыцца ў інструкцыі, патрабавалі ўжыцьця мер, якія дае магчымасьць ПАЗШ узьняць цэны. ПАЗШ ня шукаюць для сябе спэцыяльных пераваг. Аднак, лічыць гэта заспакойваючае заяўленьне мае на ўвазе перш за ўсё стабілізацыю фунта. Друк падтрымліваючы афіцыяльную інспірацыю, абвінавачвае Англію ў абясцэненьні фунта, што мае мэту падарваць амэрыканскі гандаль. Газэты абвінавачваюць Англію, а таксама і іншыя Эўрапэйскія дзяржавы ў маніпуляцыях, накіраваных да зьніжэньня курсу даляра.

«Белы Дом» не хавае памеру саравацъ Оттаўскія згоды і прымусіць Англію аднавіць раней шыя суадносіны паміж далярам і фунтам. Перагаворы паміж Рузвэльтам і Макданальдам праходзяць пад знакам абвастрэньня англа-амэрыканскіх супярэчнасьцяй.

АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ

З ПАСТАНОВЫ МЕНГАРКОМУ КП(б)Б

Паказальнікі работы сельсаветаў па выкананьні пастановы ЦК КП(б)Б і бюро ГК КП(б)Б аб разгортваньні масавай сяўбы з 16-га красавіка сьведчаць аб ганебным зрыве гэтай работы па раёну (па 19 красавіка ўзарана 550 га, заскароджана 318 га, зьмешана 79 і засеяна 62 га).

Кіраўніцтва раду сельсаветаў (Сеньніца, Самахвалавічы, Абчак і інш.) і МТС ня толькі ня здолелі арганізаваць і ўзначаліць масы калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на ўдарнае разгортваньне масавай сяўбы і бляумоўнае ажыцьцяўленьне дырэктывы ЦК КП(б)Б аб выкананьні пляну сяўбы аўса па раёну да 25 красавіка, але аказаліся ў хвасьце ярка выяўленых кулацкіх установак супроць выхаду ў поле і. спроб апраўдаць нявыхад на масавую сяўбу «аб'ектыўнымі» прычынамі і спасыланьнямі на дрэннае надвор'е.

Паасобныя ўпаўнаважаныя ГК КП(б)Б па сяўбе (т. Нэйштат) ня толькі ня здолелі зламаць супраціўленьня выхаду у поле, але паддаліся настроям немагчымасьці разгортваньня масавай сяўбы.

Побач з гэтым, праверкай ГК КП(б)Б на мясцох устаноўлена, што работа па арганізацыі мас калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў на правядзеньне веснавой сяўбы ўсё яшчэ ведьмі дрэнна зьвязана з пытаньнем уздыму ўраджайнасьці і выкарыстаньня работы па давядзеньні абавязацельстваў на пастаўку дзяржаве сельска-гаспадарчых прадуктаў (збожжа, бульбы і інш.) для стымуляваньня зацікаўленасьці калгасьніка і працоўнага аднаасобніка ў выкананьні і перавыкананьні ўстаноўленых па раёну норм ураджайнасьці.

Паасобныя кіруючыя работнікі сельсаветаў і ячэек нават ня ведаюць аб гэтых нормах (сакратары Абчацкай і Новадворскай сельячэек т. т. Лукерчык і Крыцкі, старшыня Абчацкага сельсавету т. Халадзінскі, сакратар парткалектыву Лошыцкага садова-гароднага інстытуту т. Купрэвіч). Як вынік гэтага, у плянах паасобных калгасаў нормы ўраджайнасьці былі зьменшаны і гэта скажэньне ня выпраўлена да апошняга часу (калгас «Адраджэньне», Абчацкага сельсавету—бульбы 108 цэнтнэраў з га замест 115).

У паасобных мясцох выяўлены факты шкодніцкіх кулацкіх установак у вытворчых плянах калгасаў у адносінах тэрмінаў сяўбы (Ратамскі сельсавет звыш 40 дзён), а таксама недапушчальнага расьцягваньня тэрмінаў шляхам мэханічнага складаньня колькасьці дзён, запраектаваных на пасеў збожжавых і бульбы (Абчак).

Кіраўніцтва з боку МТС застаецца не канкрэтным і неапэрацыйным.

Сакратырыят Менгаркому КП(б)Б пастанаўляе:

Катэгарычна папярэдзіць сакратароў сельпарт'ячэек, старшынь сельсаветаў, гарэзямаддзел, дырэктароў 1 і 2 МТС т. т. Шэлега і Каляду, што ГК КП(б)Б не дапусьціць найменшых адхіленьняў у справе выкананьня пастановы ЦК КП(б)Б аб выкананьні пляну сяўбы аўса на раёне да 25 красавіка і што яны персанальна нясуць адказнасьць за ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай задачы.

Папярэдзіць дырэктароў прыгарадных саўгасаў і дырэктароў прадпрыемстваў, што яны нясуць поўную адказнасьць за бязумоўнае сканчэньне сяўбы аўса да 25 красавіка, пры поўным захаваньні якаснай апрацоўкі глебы і добраякаснай сяўбы.

ГК КП(б)Б прапануе павесьці самую бязьлітасную барацьбу супроць канкрэтных посьбітаў варожых установак і настрояў аб немагчымасьці разгортваньня масавай сяўбы, супроць апартуністаў і выцікаў, якія прыкрываюцца шыльдай «аб'ектыўных» прычын, супроць кіраўнікоў, пядольных арганізатараў масы на бявое выкананьне заданьня партыі, супроць контр-рэвалюцыйных чутак, накіраваных на падрыў масавай сяўбы, выкрываючы антысавецкую, кулацкую сутнасьць гэтых праяўленьняў.

Гарэзямаддзелу, МТС, сакратаром ячэек і старшыням сельсаветаў на працягу сутак праверыць вытворчыя пляны калгасаў, на хаду выпраўшы скажэньні і шкодніцкія ўстаноўкі ў тэрмінах сяўбы і нормах ураджайнасьці.

Усю работу па разгортваньні масавай сяўбы арганізаваць ўвязваць з работай на давядзеньні да калгасаў, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў абавязацельстваў па здачы сельска-гаспадарчай прадукцыі дзя

АБ УЦЯГНЕНЬНІ ЖАНЧЫН-КАЛГАСЬНІЦ У ПАДРЫХТОЎКУ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

ПАСТАНОВА ЦК І СНК БССР

ПА ДАКЛАДАХ ПУХАВІЦКАГА І ДРЫСЕНСКАГА РК КП(б)Б

1. Адзначыць, што ў Дрысенскім і асабліва ў Пухавіцкім раёнах з боку партыйных, савецкіх арганізацый наглядаецца недаацэнка ролі жанчын у справе падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы, неахайныя адносіны да справы вылучэньня іх па кіруючую калгасную работу і да культурна-бытавога абслугоўваньня калгасніц.

Так па раду калгасаў («Усходняя Зара»—Дрыса, «Асоавіяхім» і «Калініна»—Пухавіцкі раён) жанчыны калгасніцы зусім ня ўцягнуты ў пастаянныя паляводныя вытворчыя брыгады і ў большасьці скарыстоўваюцца па другарадных работах. Ёсьць выпадкі арганізацыі асобных жаночых брыгад («Чырвоны транспартнік»—Пухавіцкі раён).

Зусім нездавальняючай зьяўляецца справа вылучэньня калгасніц брыгадзірамі, асабліва ў паляводных брыгадах (у Дрысенскім раёне ў 270 брыгадах—жанчын-брыгадзіраў 6 чалавек, у Пухавіцкім—5).

Няма ні адной жанчыны—старшыні калгасу, і ні адна ня была падрыхтавана на курсах старшынь калгасаў. Нездавальняючае кіраўніцтва з боку партыйных і савецкіх арганізацый у справе адкрыцьця летніх ясьляў і плянаваньня.

2. ЦК і СНК разглядаюць такое становішча, як недапушчальнае ігнараваньне з боку РК КП(б)Б дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб уцягненьні калгасніц і аднаасобніц—бяднячак і серадняцтва у падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы і вылучэньне жанчын па кіруючую калгасную работу. Прапанаваць Пухавіцкаму і Дрысенскаму РК КП(б)Б забясьпечыць правільную расстаноўку і поўнае скарыстаньне жаночай сілы ў калгасах у часе веснавой сяўбы, праполачнай і ўборачнай кампаній.

Адзначаючы, што факты выкрытыя ў Пухавіцкім раёне лішні раз сьведчаць аб невыстарчальнай увазе з боку раённых арганізацый да справы вылучэньня калгасніц, абавязаць пэрсанальна тав. Тарасава ў часе веснавой сяўбы гэтага году стварыць сапраўдны пералом у гэтай справе.

3. Прапанаваць Пухавіцкаму і Дрысенскаму РК неадкладна праверыць ход падрыхтоўкі і арганізацыі дзіцячых устаноў па калгасах і саўгасах, патрабаваўшы адказнасьці за гэту справу ад РВК, райаховы здароўя, райана і райза. Аслабаніць работнікаў райаховы здароўя па час веснавой сяўбы ад іншых нагрузак з тым, каб забясьпечыць сваячасовае адкрыцьцё прадугледжаных плянам бытавых устаноў у калгасах.

Лічыць, што галоўнай работай жан сэктару ЦК па час веснавой кампаніі зьяўляецца дапамога раёнам у справе арганізацыі калгасніц.

4. Прапанаваць РК КП(б)Б даць указаньні ячэйкам і ўпаўнаважаным па сельсаветах аб неабходнасьці выпраўленьня скажэньняў, якія дапускаюцца ў радзе калгасаў пры арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад (арганізацыя асобных мужчынскіх і жаночых брыгад). Правесьці праверку ўцягненьня калгасніц у пастаянныя паляводчыя брыгады і выкананьня дырэктыў ЦК аб вылучэньні лепшых калгасніц-ударніц брыгадзірамі, пра дугледзеўшы, у першую чаргу, вылучэньне лепшых ударніц-калгасніц у паляводных брыгадах аратымі, коньмі хамі, машыністамі, а таксама і ў якасьці брыгадзіраў паляводных брыгад.

Улічваючы надзвычай дрэнпае становішча са справай вылучэньня жанчын старшынямі калгасаў, прапанаваць РК правесьці ў пэрыяд міжпапар'я спэцыяльныя курсы падрыхтоўкі лепшых калгасніц-ударніц старшынямі калгасаў з тым, каб забясьпечыць вылучэньне ня менш 4-5 жанчын у кожным раёне старшынямі калгасаў на працягу да 1-га жніўня 1933 году. Абавязаць Наркамзем, пэрсанальна т. Кудзельскага на справе правесьці вызначаны плян падрыхтоўкі кадраў калгасніц у сельскай гаспадарцы.

5. Асаблівую ўвагу ў працы сярод жанчын РК і ячэйкі павінны зьвярнуць на работу дэлегацкіх сходаў, на перапясеньне работы з дэлегаткамі ў калгасныя паляводныя вытворчыя брыгады з тым, каб калгасніцы-дэлегаткі былі сапраўднымі застрэльшчыкамі разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў правядзеньні веснавой сяўбы, праполачнай і ўборачнай кампаніяй, сапраўднай апорай парт'ячэек у рабоце сярод калгасніц і аднаасобніц бяднячак і серадняцтва, у барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці і арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаваньне калгасаў.

Пра падвоз да чыгуначных станцый, прыстаняй і пагрузачных пунктаў грузаў, пагрузку і выгрузку іх у дні 1-га і 2-га мая

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

У выкананьне распараджэньня старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР т. МОЛАТАВА, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць усім народным камісарыятам, гаспадарчым арганізацыям і аўтагужавым гаспадаркам забясьпечыць у дні 1-га і 2-га мая падвоз да чыгуначных станцый, прыстаняй і пагрузачных пунктаў грузаў, пагрузку і выгрузку іх.

2. Абавязаць упаўнаважаных НК Шляхоў і НК Водзнага Транспарту забясьпечыць бесперабойную работу ў дні 1-га і 2-га мая чыгуначных станцый, прыстаняй і пагрузачных пунктаў, не дапускаючы зьніжэньня выкананьня сутачных норм.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Кіраўнік справаў Савету Народных Камісараў БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.

18 красавіка 1933 г.

ДА 63 ГАДАВІНЫ З ДНЯ НАРАДЖЭНЬНЯ У. І. ЛЕНІНА

Н. К. Крупская

АБЛІЧЧА ЛЕНІНА, ЯК ЧАЛАВЕКА

Аблічча Леніна як чалавека надзвычай цікавіць моладзь. Я хачу сёньня спыніцца на гэтым пытаньні.

Мы ведаем, будаўніцтва сацыялізму заключаецца ў перабудове ня толькі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, але і людзі становяцца іншымі. У якім кірунку мяняецца аблічча людзей?

Калі ў 90-х гадох пачалі ўзьнікаць у студэнцкім асяродзішчы марксыцкія гурткі, спачатку вельмі горача абмяркоўвалася пытаньне аб ролі асобы ў гісторыі. Чыталі артыкул Міхайлоўскага «Герои и толпа». Тады большасьць нават перадавых дзеячаў лічыла, што рухавікамі прагрэсу зьяўляюцца крытычна мыслячыя асобы, героі, за якімі ідзе бязьлічная шэрая маса, натоўп.

«Натоўп» трактуецца абыякавна да таго—ці быў гэты натоўп рабочых, сялян, салдат, абываталяў. Проста—неасьвечаная маса. Гэта маса толькі пераймае, ведуць яе героі. Натоўп—гэта нешта сьляпое. Натоўп ведуць за сабой людзі, якія ўмеюць рабіць на натоўп уражаньне, гіпнатызаваць і захапіць яго. Памятаю, як мы, маладыя марксысты, абураліся гэтым артыкулам Міхайлоўскага, гэтай пагардай да масы.

Карэньні падобных поглядаў пажалі ў далёкім мінулым. У пачатку XIX стагодзьдзя пануючай клясай у нас у краіне было дваранства. Для дваранства сялянства зьяўлялася натоўпам рабоў, цёмным, прыгодным толькі на тое, каб пакорліва слухацца сваіх дабрачынцаў—паноў. Паны ня ведалі сваіх рабоў, ня цікавіліся імі як людзьмі, для іх гэта была «чорнь». Ідэі Вялікай францускай рэвалюцыі, якая зьмяла дваранства і разьвязала рукі буржуазіі, пра сякнулі і ў Расію: асабліва шмат для іх прасякненьня зрабіла ўварваньне францускіх войск, 1812 год. Але гэтыя ідэі, накіраваныя супроць прыгоньніцкіх путаў, не даходзілі да сялянства, а прасякалі толькі ў вышэйшыя пласты дваранства. Яны не маглі захапіць дваранства як клясу, бо быў перш за ўсё накіраваны супроць яе. Яны захаплялі толькі асобных прадстаўнікоў гэтай клясы, але і для апошніх гэтыя ідэі не зьяўляліся, не маглі зьяўлятцца кіраваньнем да дзеяньня, дый праламляліся яны ў іх галовах вельмі своеасабліва. Гэтыя ідэі давалі асобам з дваранскага стану, якія імі захапляліся, толькі поўнае разьвіцьцё, якое узьнімала іх над акружаючым асяродзішчам. Гэтыя людзі адчувалі сябе адзінокімі, незразумелымі.

Па-сутнасьці-ж справы іх погляды на жыцьцё, на працу, на ўзаемаадносіны людзей, на любоў, на дружбу, на працоўную масу заставаліся глыбока ўпасьніцкімі, хоць і выказваліся часамі новай фразэалёгіяй. У рускай літаратуры гэта зьявішча даволі ярка адлюстравана ў творах Пушкіна і Лермантава. Культ асобы, пагоня за сэнсам, каханьне—глыбокі запал, які дае моцныя перажываньні, трактоўка прадмету каханьня, як упасьнасьці, дзіная зайздрасьць, дружба... «ЧТО ДРУЖБА? ЛЕГКИЙ ПЫЛ ПОХМЕЛЬЯ, ОБИДЫ ВОЛЬНЫЙ РАЗГОВОР, ОБМЕН ТШЕСЛАВИЯ, БЕЗДЕЛЬЯ, ИЛЬ ПОКРОВИТЕЛЬСТВА ПО ЗОР»—пісаў Пушкін. Маса—чэрнь. Пушкін зпісваў, як натхнёвы паэт бранчаў на піры, «а вкруг народ не просвещенный ему бессмысленно внимал».

Ідэі буржуазнай свабоды, якія дакочаліся з Захаду, пакідалі незакрануты гэту ўпасьніцкую псыхалёгію таму, што і псыхалёгія самой буржуазіі наскрозь была ўпасьніцкай, індывідуалістычнай. Дый ідэі аб свабодзе насілі вельмі напэўны, павархоўны характэр. І толькі нязначная групка дваран з ваеннага асяродзішча, якая найбольш блізка датыкалася з Захадам, папрабавала пакласьці канец царскаму самаўладзтву. Спроба дэкабрыстаў пацярпела паражэньне і не магла не пацярпець яго, бо не апіралася ні на які масавы рэвалюцыйны рух.

Капіталістычныя формы гаспадараньня, якія нараджаліся ў краіне, разьвіцьцё прамысловасьці разбурылі фэадальны ўклад, бязьмерна абвастраючы эксплёатацыю сялянства, бязвыходнае становішча якога даводзіла яго да стыхійных бунтаў. Стваралася глеба для рэвалюцыйнага руху. На гэты раз носьбітам рэвалюцыйных ідэй была рэвалюцыйная інтэлігенцыя. Яна ўжо не глядзела з пагардай на сялянскія масы. Яна, наадварот, ідэалізавала іх, не заўважвала іх дробна-буржуазнай клясавай сутнасьці, скідвала з рахунку сялянскую дробна-ўласьніцкую псыхалёгію, разьднанасьць сялянства, якая вынікала не з расклёнасьці яго, не з бездарожжа, а з усяго жыцьцёвага ўкладу дробнага ўласьніка, які трымаўся правіла: «кожны за сябе, а гаспадзь бог за ўсіх». Дробна-ўласьніцкая псыхалёгія не процістаяла дваранска-ўласьніцкім поглядам на сям'ю, каханьне, не процістаяла культу асобы, культу героў.

Пралетарыят у нас яшчэ тады ня склаўся як кляса, а сялянства было цёмнае і бясьсільнае, і гэта налажыла пячатку на наш рэвалюцыйны рух. Ён трымаўся на гераізьме рэвалюцыйных адзіночак, якія аддавалі свае жыцьцё за «народ», а «народ» стаяў у баку і не разумеў іх. Так і дажылі мы да 90-х гадоў. У 90-я годы гуляла тэорыя Міхайлоўскага, у якой дзіворна пераплятала панская пагарда да натоўпу з культам героя-рэвалюцыянэраў.

Маладыя марксысты 90-х гадоў глыбока абураліся такой пастаноўкай пытаньня. Яны расшыфроўвалі паняцьце «народ», яны бачылі рухаючую сілу рэвалюцыі ў рабочай клясе, у ёй бачылі праваздыра ўсіх працоўных, а ролю «асобы» ў гісторыі яны бачылі ў тым, што «асоба» павінна як можна бліжэй стаць да рабочай клясы, уключыцца ў яе барацьбу, яе справа павінна стаць яе справай. Рэвалюцыйны марксыст не процістаўляў сябе рабочай масе, ён ставіў сваёй задачай як можна лепш змагчы выказаць тое, што перадавая частка рабочай клясы думае, адчувае, да чаго імкнецца.

Марксызм непарыўна зьвязан са зьменай поглядаў на толькі на рухаючую сілу рэвалюцыі, ён зьмяняе ў корані старыя ўласьніцкія погляды на сям'ю, жанчыну, на дзяцей, на ўмовы іх разьвіцьця, выхаваньне, на мэты выхаваньня. Адмаўляючы прыватную ўласнасьць на сродкі вытворчасьці, марксызм адмаўляе і погляд на жонку і дзяцей як на ўласнасьць. Рэвалюцыйны марксыст перш за ўсё—калектывіст і гэта зьмяняе ў корані яго адносіны да акружаючых людзей. Буржуазны «індывідуаліст»—глыбокі эгаіст—ставіць на першы плян свае асабістыя інтарэсы, ён ня ўмее адносіцца да другога чалавека, хоць-бы самага блізкага, як да таварыша, як да прыяцеля.

Дружбу ён разумее па Пушкіну («легкий пыл похмелья» і інш.). Дружба такая, як памяж Марксам і Энгельсам, яму недаступна, незразумела. Яму незразумела, як многа дае чалавеку сумесная работа, якой крыніцай радасьці зьяўляюцца для яго зносіны ў рабоце над агульнай справай, як расьце ён на калектыўнай рабоце і як многа дае другім. Калектыў— не абязьлічка. Правільна арганізаваны, правільна мэтаімкнёны калектыў—гэта нешта такое, у чым чалавек не растварэецца, не тане. Наадварот, у калектыве значна глыбей разьвіваюцца ўсе яго сілы, больш ярка выяўляецца яго асоба. Мяняецца погляд чалавека на працу, праца перастае быць «пакараньнем гаспадным» а становіцца крыніцай радасьці. «Індывідуаліст» адзінокі, рэвалюцыйны марксыст-калектывіст цесна зьвязан з тымі людзьмі, з якімі робіць агульную справу, з якімі змагаецца рука аб руку. Ён ня носіцца са сваім «я», ён не аддзяляе яго ад «мы». У такога калектывіста зусім іншае, чым і «індывідуаліста» ўяўленьне аб тым, што дрэнна, што добра, другое ўяўленьне аб дабры і зьле, аб тым, што такое шчасьце. Жыцьцё калектывіста - рэвалюцыйнага марксыста—значна паўнейшае і шчасьлівейшае.

Але прычым тут Ленін? — запытае чытач. У пачатку было-ж сказана, што гутарка будзе ісьці пра Леніна як чалавека, пра яго аблічча.

Ленін быў рэвалюцыйным марксыстам і калектывістам да глыбіні душы. Усё яго жыцьцё, дзейнасьць былі падначальны адной вялікай мэце—барацьбе за перамогу сацыялізму. І гэта накладвала пячатку на ўсе яго пачуцьці і мысьлі. Для яго чужой была ўсякая дробязнасьць, дробная зайздрасьць, зло бэ, помсьлівасьць, фанабэрыстасьць, вельмі ўласьцівая дробна-ўласьніцкім індывідуалістам.

Ленін змагаўся, рэзка ставіў пытаньні, але ніколі ня ўносіў ён у спрэчкі нічога асабістага, падыходзіў да пытаньняў з пункту гледжаньня справы і таму таварышы звычайна ня крыўдзіліся на яго рэзкасьць. Ён вельмі ўважліва ўглядаўся ў людзей, прыслухоўваўся ў тое, што яны гаварылі, стараўся ахапіць самую сутнасьць і таму ён умеў па радзе нязначных дробязяй упаўліваць аблічча чалавека, умеў вельмі чула падыходзіць да людзей, раскрываць у іх усё добрае, каштоўнае, што можна паставіць на службу агульнай справе.

Пастаянна прыходзілася наглядаць, як, прыходзячы да Ільліча, чалавек стаў навіўся другім, і за гэта любілі таварышы Ільліча, а сам ён чэрпаў з сувязі з імі столькі, колькі вельмі рэдка хто другі мог пачарпнуць. Вучыцца ў жыцьці, у людзях ня ўсякі ўмее. Ільліч умеў. Ён ні з кім ня хітрыў, не дыпляматнічаў, не ашукваў нікога, і людзі адчувалі яго шчырасьць, прастату.

Клопаты аб таварышох былі яго характэрнай рысай. Ён клапаціўся аб іх і содзячы ў турме, і знаходзячыся на волі, у ссылцы, у эміграцыі, і калі ён стаў старшынёй Савету народных камісараў. Клапаціўся ня толькі аб таварышох, але і аб вельмі далёкіх людзях, якія адчувалі патрэбу ў яго дапамозе. У адзным лісьце Ільліча, які захаваўся ў мяне, ёсьць такая фраза: «Лісты аб дапамозе, якія да цябе часам і пры ходзяць, я чытаю і стараюся рабіць, што можна». Гэта было летам 1919 году, калі другіх клопатаў было ў Ільліча больш чым даволі. Ішла грамадзянская вайна ва ўсю. У тым-жа лісьце ён піша: «Крым, здаецца, у белых». Справы было больш чым даволі, але ніколі я ня чула ад Ільліча, што ў яго ня было часу, калі справа ішла аб дапамозе людзям.

Ён мне заўсёды гаварыў, што я павін на больш клапаціцца аб таварышох па рабоце і аднойчы, калі ў часе чысткі партыі беспадстаўна нападалі на аднаго з маіх работнікаў па Наркамасьветы, ён знайшоў час капацца ў старой літаратуры, каб знайсьці матар'ял, што гэты работнік, яшчэ будучы бундаўцам, яшчэ да Кастрычніка абараняў бальшавікоў.

Ленін—добры чалавек, гавораць іншыя... Але слова «добры», узятае са старога пенсыкону дабрачыннасьці, мала падыходзіць да Ільліча; яно невыстарчальнае і недакладнае.

Ніколі ня было ў Ільліча ні сямейнай, ні гуртковай замкнутасьці, такой характэрнай для старых часоў. Ён ніколі не аддзяляў асабістае ад грамадзкага. Гэта ў яго зьлівалася ў адно цэлае. Ніколі ня мог-бы ён пакахаць жанчыну, з якой-бы ён разыходзіўся па поглядах, якая ня была-б таварышом па рабоце. Ён палка прывязаўся да людзей—тыповая яго прывязанасьць да Плеханава, ад якога ён так многа атрымаў, але гэта ніколі не перашкоджала яму вагаць ва ўсю з Плеханавым, калі ён бачыў, што Пляханаў ня мае рацыі, што яго пункт гледжаньня шкодзіць справе, не перашкоджэла яму канчаткова парваць з ім, калі Пляханаў стаў аборонцам.

Посьпехі справы глыбока радавалі Ільліча. Справа—гэта было тое, чым ён жыў, што ён любіў і што яго захапляла. Ленін стараўся як можна бліжэй падыйсьці да масы і ён умеў гэта рабіць. Сувязь з рабочымі давала яму самому вельмі многае. Давала сапраўднае разуменьне задач барацьбы пралетарыяту на кожным этапе. Калі мы ўважліва вывучым, як працаваў Ленін як навуковы работнік, як прапагандыст, як пітаратар, як рэдактар, як арганізатар, мы зразумеем яго і як чалавека. З тысячы заўваг, нават асобных выразаў, зва ротаў гутаркі, раскіданых у яго артыкулах і прамовах, глядзіць асоба Ільліча—калектывіста, барацьбіта за рабочую справу. Быць калектывістам, барацьбітом за рабочую справу—вялікае шчасьце. Чалавек увесь час адчувае, як ўсё шырэй становіцца яго кругавід; паглыбляецца разуменьне жыцьця, пашыраецца поле дзейнасьці, як расьце яго ўмень не працаваць: ён адчувае, як ён расьце разам з ростам масы, разам з ростам справы. І таму так зарэзьтава сьмяяўся Ільліч, так весела жартаваў, так лю біў ён «зялёнае дрэва жыцьця», столькі радасьці давала яму жыцьцё. Ленін ня мог-бы стаць такім, якім ён быў, калі-б ён жыў у другую эпоху, а не ў эпоху пралетарскай рэвалюцыі і будаўніцтва сацыялізму. Тэорыя марксызму дала яму глыбокую перакананасьць у перамозе справы пралетарыяту, дала яму неабходную празорлівасьць; барацьба і работа ў выключнай блізкасьці да пралетарыяту, за справу пралетарыяту, выхавалі ў Ільлічу рысы чалавека будучага, аблічча якога так адрозьніваецца ад аблічча дваранскага героя, ад аблічча буржуазнага і дробна-буржуазнага героя, так далёкіх ад натоўпу.

Зразумець Ільліча як чалавека—значыць глыбей, лепш зразумець, што такое будаўніцтва сацыялізму; значыць, адчуць аблічча чалавека сацыялістычнага ладу.

ЭНЭРГІЯ ДНЯПРА ІДЗЕ Ў ТРАНСФАРМАТАРЫ



На здымку: Мантаж батарэі трансформатараў на Дняпроўскай ГЭС імя Леніна.

НКА ЗДАРОЎЯ ТОЛЬКІ АБЯЦАЕ...

(Ліст загадчыцы ясьляй)

Ужо два гады НК аховы здароўя абяцае зрабіць капітальны рамонт у памяшканьні ясьлей № 8. Але абяцаньні і да сёньняшняга дня застаюцца толькі абяцаньнямі. Між тым, другі паверх пому, дзе знаходзяцца ясьлі, зусім асоў і патрэбуе абналам. Дом разьядае грыбок, які, па словах тэхніка, зьяўляецца вельмі небясьпечным для дрэва.

Адпаведныя арганізацыі, якія пераспрадна павінны былі-б зацікавіцца станоўлічнам ясьлей, не аддаюць ім належнай увагі. Шмат разоў я кідала ў НК і гарадзкі аддзел аховы здароўя і нічога не магу дабіцца, бо гэтыя ўстановы адсылаюць адна да аднэй.

Такіх бюракратычных адносін далей нельга цярпець. Гэта патрэбна жыцьцю 80 дзяцей. Рамонт паспіх быць зроблен неадкладна.

Фрыдман.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» чакае ад НК аховы здароўя неадкладнага рэзгаваньня на факты абураючага становішча ў ясьлях № 8.

Па сьлядох неапублікаваных лістоў рабочых і калгасьнікаў

Заметка селькора Бачыўшкага **«Аб бязьдзейнасьці кіраўніцтва калгасу «Ленінская іскра»**, Пытрыкоўскай РКК-РСІ праверана. Факты пацьвердзіліся. Старшыні калгасу **Пракопчыку** за продаж насенньня бульбы без ведама і згоды праўленьня і сходу калгаснікаў абвешчана вымова. Справа аб правасы калгаснага возу перадана сьледчаму для расьледваньня і прыцягненьня да судовай адказнасьці вінаватых.

***

Допіс А. М. Н. **«Драцца за лён»** Бярэзінскі РКК-РСІ праверан. Факты пацьвердзіліся. Сакратар райкому ЛКСМ **Тоўсцік** за голае адміністраваньне пры выкананьні загатовак ільнапалкіна, ужываньне фізычных мер узьдзеяньня—зьнят з работы, выключан з партыі і аддан пад суд.

***

Чачуская РСІ праверыла допіс сельскора **«Зрыў збожжазагатовак»** і лавае ласкіне, што старшыня сельсавету **Міндрыкаў** і сакратар **Быкаў** за п'янства выключаны з партыі і аддны пад суд.

***

Допіс селькора **«Аб становішчы Грыцкаўскай парт'ячэйкі»** Крупскай РКК КП(б)Б праверан. Грыцкаўская парт'ячэйка сапраўды была засмечана кулацка-варожымі элементамі, адсутнічала самакрытыка, праяўленні ліквідацкіх адносіны да скажэньня лініі партыі з боку пасобных работнікаў парт'ячэйкі і сельсавету. Сакратар парт'ячэйкі **Рогаў** і старшыня сельсавету **Мазанік** за шкодную работу, разбураньне калгасу «Чырвоны барацьбіт», папойкі і шмат іншых учынкаў выключаны з партыі і зьняты з работы.

***

Матар'ял калгаснніка **«Аб безгаспадарчасьці ў калгасе імя Варашылава»** Глускай РКК-РСІ праверан. Факты пацьвердзіліся. Старое праўленьне калгасу за безгаспадарчасьць, папойкі, пакражы, распушчана. Загатовак конскай фэрмы **Фіско А.** за шкодныя адносіны да коняй зьнят з работы і аддан пад суд.

***

Заметка брыгадзіра **«Забыты вучастак»** Клічаўскай РКК-РСІ праверана. Старшыня сельсавету **Шадура** і сакратар ячэйкі КП(б)Б **Уленя**, які зьяўляецца і старшынёй сельскіяўтаварыства за рад скажэньняў клясавай лініі і праўленьне апартуністу ў часе загатовак—выключан з партыі і аддан пад суд.

І. А. ЛЫЧОЎ

Жорстка караць ворагаў народу, раскрадваючых сацыялістычную ўласнасьць

Асновай нашага ладу зьяўляецца грамадзкая ўласнасьць, таксама як асновай капіталізму — уласнасьць прыватная». (СТАЛІН).

Заваляньне ўлады пралетарыятам ня значыць патуханьне клясавай барацьбы. Наадварот, наступае найбольшае абвастрэньне клясавай барацьбы і рознастайнасьць яе форм. Клясавы вораг хутка мяняе сваю тактыку ў залежнасьці ад абстаноўкі і ўмоў.

Студзеньскі пленум у сваіх гістарычных настановах і выступленьнях правадыра т. Сталіна даў ацэнку суадносін клясавых сіл у нашай краіне. Клясавы вораг прайграў бой, але ён яшчэ існуе. Яго сілы таюць, але яго лютая нянавісьць расьце. Рабочая кляса канчаткова ўмацавалася на сацыялістычным шляху. Перамога сацыялізму забясьпечана. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі і яе геніяльнага правадыра т. Сталіна паказала, што яна можа ня толькі руйнаваць старое, але і добра будаваць новае.

Клясавы вораг, бачачы, што сацыялізм існуе на моцным фундамэнце, вораг, страціўшы свае эканамічныя пазыцыі, перамяніў сваю тактыку: ад лабавой атакі ён перашоў да ціхай сапы ў сваёй антысавецкай, шкоднішкай рабоце. Новая форма барацьбы клясавага ворага — **зладзейства і раскрадваньне сацыялістычнай уласнасьці.** Гэта таму, што «асновай савецкай гаспадаркі зьяўляецца сацыялістычная ўласнасьць» **(Сталін).**

Новае сымаль вычаткаў, калі ворагу «аручней» раскрадваць праз «камуністаў»—перараджэнцаў з партыйным білетам.

Клясаваму ворагу лягчэй шкодзіць праз антыграмадзкія элемэнты, жулікаў, дармаедаў, зладзеяў — ворагаў сацыялізму.

Факты зладзейства раскрадваньня сацыялістычнай маёмасьці ў апошні час па сваіх формах і мэтадах сьведчаць аб растучай нагласьці клясавага ворага.

Чым гэта тлумачыцца? Гэта тлумачыцца тым, што «адживаючыя клясы супраціўляюцца не таму, што яны сталі мацнейшымі, за нас, а таму, што сацыялізм расьце хутчэй за іх і яны становяцца слабейшымі, чым мы. Іменна таму, што яны адчуваюць апошнія дні свайго існаваньня, яны і вымушаны супраціўляцца ўсімі сіламі, усімі сродкамі» **(Сталін).**

Прывядзем некалькі яркіх прыкладаў з матар'ялаў ЦКК і райКК-РСІ, якія пацьвярджаюць тэзіс, што разьбіты, але яшчэ недабіты клясавы вораг узмацніў за апошні час спробы падарваць аснову савецкага ладу — спробы зьнішчыць грамадзкую ўласнасьць. Клясавы вораг прабуе рабіць гэта як непасрэдна сам, так і рукамі сваіх агентаў, выкарыстоўваючы для раскрадваньня сацыялістычнай маёмасьці тыя зьвеньні, дзе дрэнна пастаўлен улік, бо там, дзе няма ўліку і кантролю — там раскрадваюць.

Пацьвердзім фактамі. Па сыстэме спажыўкаапэрацыі БССР, карыстаючыся адсутнасьцю выстарчальнага ўліку і кантролю на 1-X—32 г. 1.247 тыс. руб. растрачана і раскрадзена работнікамі спажыўкаапэрацыі.

Гэта салідная лічба растрачаных грошай гаворыць за тое, што ня было настойлівай барацьбы з клясавароживі элемэнтамі ў сыстэме спажыўкаапэрацыі. Гэта сьведчыць аб вялікай засьмечанасьці сеткі спажыўка апэрацыі нэпманскім элемэнтам. Гэта пацьвярджае паяўнасьць гнілога лібэралізму да зладзеяў сацыялістычнай уласнасьці.

Разам з тым у сыстэме спажыўкаапэрацыі існуе «тэорыя», што «растраты зьяўляюцца вынікам «някультурнасьці»(?) работнікаў каапэрацыйнай сыстэмы»...

Такія «размовы» на руку клясаваму ворагу.

Верасьнёўскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) па пытаньні аб каапэрацыі гаворыць:

«Указаньне партыі пакінуць напэўнасьці нейкага нэпманскага духу ў рабоце каапэрацыі пабыкае ва ўмовах разгортваньня савецкага гандлю асабліваё значэньне. Выкараненьне ўсіх відаў праяўленьня нэпманскага духу, рашучая барацьба са спэкуляцыйным уздуваньнем цэн, растратамі, самаспажываньнем і асабліва з раскрадваньнямі ў гандлёвым апараце — зьяўляецца зараз адной з асноўных задач партыйных і савецкіх арганізацый».

Гэта ўказаньне партыі павінны ўсвоіць у першую чаргу работнікі спажыўкаапэрацыі. Замест спасыланьняў на «някультурнасьць» раскрадальнікаў — весьці самую бязьлітасную барацьбу са зладзеямі сацыялістычнай уласнасьці і ачысьціць апарат спажыўкаапэрацыі ад клясавага ворага.

Узорам страты партыйнай і клясавай пільнасьці бюро ячэйкі і МК зьяўляецца справа аб раскрадваньні фонду прэміяваньня ў апараце **ўпаўнаважанага наркома замежнага гандлю БССР.** Узор, як «камуністы» выкарысталі свае становішча, займаемую пасаду для сваіх уласных **шкурніцкіх мэтаў.** Узор, як перараджэнцы працягнулі свае брудныя лапы да грамадзкай уласнасьці і самаснабжаліся ва ўсю.

Упаўнаркамзамежгандлю БССР меў фонд прэміяваньня за колькаснае і якаснае выкананьне і перавыкананьне экспартных плянаў асобнымі прадпрыемствамі і арганізацыямі. Гэты фонд за IV квартал 1931 г. і 3 квартал 1932 г. складаў 303.000 руб., з якіх 110.000 руб. грашыма і 192.900 руб. таварамі. Згодна існуючага палажэньня аб прэміях, прэміяваньню падлягалі арганізацыі і прадпрыемствы, якія перавыканалі плян як па колькасных, таксама і па якасных паказальніках.

Між тым праверкай устаноўлена, што гэта правіла парушалася і што фактычна прэміяльны фонд разбазарваўся спрод работнікаў цэнтральнага апарату і гэта праходзіла пры значным недавыкананьні агульных плянаў па асобных цэнтральных экспартных арганізацыях.

Разбазарваньне прэміяльнага фонду дашло да таго, што 70—80 проц. работнікаў цэнтральнага апарату Упаўнаркамзамежгандлю былі прэміяваны «за ўдарную работу», пачынаючы ад кіраўнікоў апарату і канчаючы статыстыкам.

Работнік Упаўнаркамзамежгандлю т. **Калініўскі,** які непасрэдна ведаў гэтым прэміяльным фондам, за 1932 год быў два разы прэміяваны на суму 725 руб., з якіх таварамі атрымаў 697 руб. 74 кап., у тым ліку 250 мэтраў мануфактуры, **6 пар абутку, 2 гарнітуры.**

Старшы эканаміст Упаўнаркамзамежгандлю **Шац** за 1932 г. быў два разы прэміяваны на суму 800 руб., з якіх атрымаў тавараў на 586 руб. 65 кап., у тым ліку мануфактуры 129 мэтраў.

Нам. упаўнаважанага Наркамзамежгандлю т. **Скакоўскі,** член партыі, атрымаў прэмію 500 руб., з якіх тавараў на суму 475 руб. 25 кап., у тым ліку 108 мэтраў мануфактуры.

Казінік — былы сакратар парт'ячэйкі, нам. дырэктара Белпушніны, прэміяван на 225 руб., а тавараў атрымаў на 275 руб., у тым ліку 65 мэтраў мануфактуры.

Шмуклер, камсамолец, старшыня мясцкому, інспэктар упаўнаркамзамежгандлю, прэміяван на 250 руб. і атрымаў тавараў на 291 руб. 50 кап., у тым ліку 51 мэтр мануфактуры.

Разам з разбазарваньнем прамтаварнага фонду пад відам «прэміяваньня» праходзіла і простае разбазарваньне тавараў дзякуючы сыстэме «запісак» за наяўны рахунак на агульную суму 1.020 руб.

Гэтай сыстэмай былі ахоплены як работнікі, атрымаўшыя прэміі, так асабліва работнікі, якія аказаліся непрэміяванымі і тут мы сустракаемся з такімі работнікамі, як Вайнберг (былы сакратар парт'ячэйкі), Воксэр, які атрымаў 195 мэтраў мануфактуры і 5 пар абутку і рад іншых работнікаў. Такіх «камуністаў» трэба пакараць больш строга і бязьлітасна, чым звычайных зладзеяў. Трэба памятаць, што «ўсякая слабасьць, усякае хістаньне, усякая сантыментальнасьць у гэтых адносінах — былі-б найпяйлішым злачынствам супроць сацыялізму» (Ленін).

Вось факты раскрадваньня памольнага збору. Матар'ялы райКК і ЦКК пацьвярджаюць, што «злодзеі» былых людзей, асноўная фоча іх барацьбы —раскрадваньне сацыялістычнай улас насьці.

Па **Крычаўскім раёне** раскрадзена 15.135 клгр. мукі. Вялікая засьмечанасьць клясава-чужым элемэнтам работнікаў млыноў.

У **Мазырскім раёне** кантора «Загатзбожжа» не кантралюе стану памольнага збору. Адсутнічае ўсякая праверка млыноў. Вынікі такой «работы» канторы «Загатзбожжа»—расьцягваньні, раскрадваньні (Калінкавіцкі загатпункт, работнік **Хамяк** Пётр Іванавіч). Апарат Загатзбожжа засьмечан: кладаўшчыкі — кулакі. З 1-VII—32 г. па 1-II—33 г. раскрадзена 17.858 клгр. сабранай мукі (саўгас «Ліпава» — 16.422 клгр., калгас «Рухавік рэвалюцыі — 1.118 клгр.).

У Полацкім раёне праверана 22 млыноў, выяўлен рад злачынстваў. У сыстэме раймелькіраўніцтва па млыне **Гамерня, Громаўскага** сельсавету, у часе праверкі ўстаноўлена, што ў загадчыка млыном т. **Воўкава** не хапае збожжа на млыне — 164 клгр., на гэтым-жа млыне выяўлена незаприходаваным 3 мяшкі збожжа, жыта 77 клгр., ячменю 44 клгр., аўса 50 клгр., на гэта збожжа не знайшлося гаспадара і на пытаньне: чыё гэта збожжа, **Воўкаў** адказаў: «ня ведаю, у памольных квітанцыях гэта збожжа ня лічыцца».

Чаму гэта так выходзіць? Таму, што Белзагатзбожжа слаба кіруе сваімі аддзяленьнямі на перыферыі і пізны апарат кантор Загатзбожжа па кіруе загатпунктамі.

Склад млынароў, кладаўшчыкоў засьмечан у вялікай ступені клясавым ворагам — адсюль расьцягваньні і раскрадваньні прымаюць пры памольным зборы вялікі размах.

У многіх выпадках росту раскрадваньняў, растрат сацыялістычнай уласнасьці спрыяе дрэнная работа кантрольна-рэвізій

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Забяспечыць вядучую ролю саўгасаў у веснавой сяўбе

ВЫВЕСЬЦІ ІХ У ПЕРАДАВЫЯ РАДЫ ПАСЕЎНЫХ КАЛЁН

Ня ўлічылі леташніх памылак

ГОРКІ. (Наш кар.).

Засеяць 180 гектараў аўса, 60 га ячменю, 307 га лёну, 40 бульбы і 30 каранеплодаў — такова вытворчая праграма саўгасу № 56.

Саўгас забяспечан высокакваліфікаванымі кадрамі (звыш 5 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй), с.-х. машынамі і інвентаром, трактарамі (10 машын), мае гарэнна абсталяваны майстэрні і гаспадарчыя будынкі.

Трэба сказаць, што ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы саўгас мае значныя дасягненні. Амаль закончан рэмонт трактараў, на асноўных культурах ссыпаны і ачышчаны насенныя фонды, якія захоўваюцца ў пасеўным парадку. Поўнасцю адремонтаваны збруя і заканчваецца рамонт с.-г. інвентару.

Аднак, гэта не забяспечвае поўнай падрыхтаванасці саўгасу да вясны. Не хапае каля 7 цэнтнераў насенных канюшыны, амаль ячэ тэтога ня зроблена на пратручванні іншых відаў насення. Мінеральнымі ўгнаеньнямі саўгас забяспечан толькі на 50 проц. На палі саўгасу вывезена толькі 50 проц. гною. Конскае пагалоўе далёка не ў здавальняючым стане і ня ўлічылі на гэта, слабых коней толькі зараз, калі пачынаюцца палявыя работы, збіраюцца ставіць на адпачынак.

У сувязі з павялічэннем трактарнага парку ў саўгасе адчуваецца ячэ ны недахопт трактарыстаў. Уже 2-3 тыдні таму назад было вядома, што для таго, каб забяспечыць поўную пагрузку трактараў, саўгасу патрэбна ня менш як 9 трактарыстаў. Між тым за гэты час прыйшла на работу толькі 3 трактарысты.

У саўгасе не хапае значна колькасьці палявых рабочых. Але як дырэкцыю, так і рабочы камітэт гэта зусім мала турбуе. Да гэтага часу па работную сілу заключаны толькі 4 дагаворы з калгасамі, што ні ў якім разе не забяспечвае задавальненя патрэбнасьці саўгасу ў палявых рабочых.

Найбольш слабым вучасткам зьяўляецца фарстаноўка сіл і арганізацыя працы. Дагэтуль ячэ не арганізаваны вытворчыя брыгады, ня толькі рабочыя, але і кіраўнікі вытворчых зьвеньняў ня ведаюць канкрэтна тых задач, якія стаяць перад ім на час веснавой сяўбы. Рабочыя саўгасу не пераведзены па зьдзельнічыну.

Нізкі ўраджай, атрыманы саўгасам у мінулым годзе, тлумачыцца перш за ўсё тым, што ў часе леташняй пасеўнай кампаніі надзвычай дрэнна арганізоўвалася тлеба. Зямля ўзорвалася на 2-3 вяршкі, значнае месца займалі агрэхі. Усё гэта ў сваю чаргу было вынікам таго, што ў саўгасе адсутнічала правільная арганізацыя працы, ня было зьдзельнічыны, ня было персональнай адказнасьці за выкананьне даручаных абавязкаў, адсутнічала працоўная дысцыпліна.

Відаць, што кіраўнікі саўгасу ня ўлічылі ўрокаў сяўбы мінулага году. Ні сакратар партыйнай ячэйкі **Салк**, ні старшыня рабкома **Завіш** палец аб палец не ўдарылі для таго, каб разгорнуць серод рабочых масава-выхаваўчую работу, каб мабілізаваць грамадзкасьць вакол гэтага пытаньня і правядзеньня веснавой сяўбы.

Адсутнасьць масава-выхаваўчай работы, разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва вынікае ў першую чаргу з таго, што партыйная ячэйка саўгасу не забяспечыла авангардная ролі кожнага члена і кандыдата партыі на вытворчасьці. Замест таго, каб пастанову ЦК КП(б)Б аб рабоце штэек калгасу «Искра» і «Вперед» прапрацаваць на адкрытых партыйных сходах з удзелам беспартыйных рабочых, бюро ячэйкі «пракапусьціла» гэту пастанову праз палітгурнікі, у рэзультаце чаго ня толькі ня ўсе рабочыя, але і камуністы незнаёмы з гэтым праграмным дакументам.

Далёка ня ўсе камуністы зьяўляюцца ўдарнікамі. Нават параўнаўрот: камуніст **Дарэўскі**, працуючы на трактары, сапсаваў яго. Ёсьць нямат такіх фактаў.

Прыведзеныя вышэй факты далёка не ахапляюць сабой усіх тых недахопаў, якія назіраюцца ў работе адміністрацыі, партыйнай ячэйкі і рабочкому саўгасу. Аднак і яны даюць поўнае права сьцьвярджаць аб тым, што савецкая гаспадарка № 56 да сяўбы не падрыхтавалася.

Віт. Даль.

САКРАТАР ЯЧЭЙКІ НЯ ВЕДАЕ, ЦІ ГАТОЎ САЎГАС ДА СЯЎБЫ

ПЯТРЫКОЎ. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Ячэйка саўгасу «Дарошкевічы» ячэ да гэтага часу не навярнулася тварам да вытворчага жыцьця. Цікава прывесьці такую гутарку з сакратаром партячэйкі Шыпкевічам.

— Як саўгас, забясьпечан насеньнем?

— Добра ня ведаю. Ня маю вестак.

— Колькі не хапае для веснавой сяўбы конязён?

— Не магу сказаць.

— Як забясьпечан саўгас рабочай сілай?

— Ня ведаю.

— Як справа з картофлечобай?

— Гудзілі спэчаны, але заняткаў ня было, бо кожны раз, калі мы склікалі, заняткі зрываліся з-за ня ўяўлі слухачоў.

Гэтыя адказы як нельга лепш характарызуюць становішча парт'ячэйкі. На працягу 8 месяцаў ня было ні адкрыта партыйнага сходу.

Асноўнай палітычнай задачай сёньняшняга дня — сяўбой — ячэйка не зай малася. А саўгас да сяўбы не падрыхтаўся.

Насеньне разбазарана, прычым разбазараны ня толькі ўласныя запасы, але і сьцярэвыя запасы вінзаводу, з якога ня прасьцу 1932 году ўзята: жыта 55 цэнтн., ячменю 27,5 цэнтн., кукурузы ў зярне 27 цэнтн., проса 20 цэнтн. і кукурузы ў початках 20 цэнтнераў. А ў 1933 годзе ўзята: ячменю 137,9 цэнтн. і проса 14 цэнтн. Усё гэта збожжа бралася з вінзаводу бяз усякіх нарадаў.

З арганізацыйнай работы і расстаноўкі сіл ня ачэпка стаіць ячэ годзін. Вытворчыя брыгады складзены тахнічным дырэктарам Фраловым у габінэтным парадку і то толькі 29 сакавіка. Парт'ячэйка, рабочком і рабочыя ў гэтым удзелу ня прымалі. Брыгады пабудаваны не па вучастках, а па відах работ — аральня, баранаваньнічыкі, сейбіты і г. д. Між іншым 3 10 ка мушіотаў у палявочныя брыгады ня выкучана ні аднаго. Інвэнтар за брыгадамі не замацаван і валяцца каля пушні пад адкрытым небам, іржавее і псуецца.

Каляндарнага пляну сяўбы фактыч на няма. Складзен «праект», паводле якога сяўба расьцягнута да 20 мая, прычым нават пры такіх расьцягнутых тэрмінах на хапае каля 1.600 конязён. Між тым, конай даглядаюць дрэнна, часта ганяюць развозіць брыгадзіраў, упаўнаважаных і інш., а трактары занятыя работы на полі выкарыстоўваюцца для малацьбы кукурузы для вінзаводу.

Палітвыхаваўчая работа як серод рабочых, так і серод членаў ячэйкі не праводзіцца. 6 красавіка рабочкам сумесна з дырэкцыяй саўгасу склікалі сход для абмеркаваньня норм выпрацоўкі і апчаты працы. На гэты сход са 120 чалавек зьявілася толькі 15.

Штодзённа ўзьнікае шмат пытаньняў, на якія рабочым патрабуюць адказу, але не атрымліваюць. Напрыклад, рабочаму Кучко Сьцяпану, які ў лютым працаваў працы месяц, ня было зашчана 15 рабочых дзён; Кучета Міколу — 13 рабочых дзён; Міхалевічу Фёдару, партаўніку, не запісана ў ведамасьць і не аплочана за 63 дні і г. д. Усе гэтыя факты прайшлі мімо рабочкому і партыйнай ячэйкі.

На 1 красавіка 1933 году саўгас моў заніжыванасьць рабочых па зарплаце на суму 40 755 руб. Гэта апазічанасьць пачалася ячэ з 1932 году, а сакратар ячэйкі Шыпкевіч і старшыня рабочкому ня ўжывалі нізкіх мер да ліквідацыі гэтай запазы чанасьці.

У саўгасе панучэ рвацтва, пакражы, безгаспадарчасьць. Пры перавозцы са станцыі Калцовічы было расцілана на дарозе каля 50 пудоў проса. Работніцы саўгасу Шабоўкас Грыпіна і Ящук Маша з кладовай саўгасу атрымалі па адной пудзе бацьнак, а з іх узялі трошы за дзве пары. Кладовая саўгасу, у якой хавацца апарата насеньня і сырцу вінзаводу розныя прамтавары на суму 6.000 руб., выдзецца недапушчальна адчына. Кладовай кнігі няма зусім. Кладаўшчык Корзун, член партыі, ня ведае, што ў яго ёсьць у кладовай. Улік пастаўлен зусім дрэнна.

Пры перадачы кладовай, у бытовга кладаўшчыка Казакоўскага не хапіла шмат тавараў, а зараз ён зьяўляецца старшым рабочым і кіруе, так сказаць, гаспадарчай саўгасу. Аб усіх гэтым добра ведаюць рабочым саўгасу і, зразумела, пры адсутнасьці належнай палітычна-выхаваўчай работы можны на гэтыя факты рэагуе пасвойму.

Усё гэта адбіваецца на падрыхтоўцы і правядзеньні сяўбы. У той час, калі школьныя калгасы распачалі зімняю сяўбу, саўгас не зрабіў нават пробнага выезду.

Ці ведаў аб усіх гэтых згадзанасьцях РК КП(б)Б? У саўгасе вельмі часта былі прадстаўнікі ды ўпаўнаважаныя райкому, але гэтыя прадстаўнікі не ўвакоўзілі ў работу ячэйкі. Толькі сёньняшні РК КП(б)Б, давяраўшыся аб фактычным зрыве падрыхтоўкі саўгасу да сяўбы, пастанавіў зьняць з работы сакратара ячэйкі Шыпкевіча. І толькі. Новага сакратара пакуль што няма.

М. Рабцэвіч.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА

Змагацца за пяршынства ў конкурсе —БАЯВАЯ ЗАДАЧА ЎСІХ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВАЎ

УДАРНІКАМ СЯЎБЫ—УДАРНАЕ СНАБЖЭНЬНЕ

РАГАЧОЎ. Адным з першых уключылася ў конкурс па абслугоўваньні пасеўнай кампаніі Ціхініцкае сельскае спажывецкае таварыства.

Гэта таварыства раней лічылася вельмі дрэнным. Растраты, самаснабжэньне, раскрадваньне сацыялістычнай маемасьці мелі тут у свой час шырокія разьмеры.

Пасьля ачышчэньня ад растратчыкаў, самаснабжэнцаў, чужых элемэнтаў Ціхініцкае ССТ значна перабудавала сваю работу. Кіруе ім зараз калгасьнік тав. **Сьліцыраў**, які дабіўся значных посьпехаў у каапэрацыйнай рабоце. Досыць указаць, што плян мабілізацыі сродкаў за першы квартал выкананы на 120 проц., плян тавараавароту за гэты-ж пэрыяд выкананы на 122 проц.

Актыўнасьць членаў праўленьня, прыцягненьне да работы масы пайшчыкаў, цесная ўвязка работы ССТ з вытворчымі задачамі калгасаў—далі вельмі добрыя вынікі.

Абвешчаны «Зьвяздой» і прэзыдыумам Белкаапсаюзу конкурс на лепшае сельспажыўтаварыства выклікаў вялікі энтузіязм работнікаў Ціхініцкай каапэрацыі і каапэрацыйнага актыву.

15 красавіка праўленьне сельспажыўтаварыства разам з каапэрацыйным калгасным актывам правяло па шыранае пасяджэньне, на якім абгаварвалася адозва зьлёту ўдарнікаў каапэрацыі Рагачоўшчыны. На пасяджэньні прыняты канкрэтныя меры, каб паленьшыць абслугоўваньне пасеўнай кампаніі.

У сваіх выступленьнях калгасьнікі запаўнілі «Зьвязду» і прэзыдыум Белкаапсаюзу, што пляны сяўбы будуць выкананы раней вызначанага тэрміну. Прадстаўнікі калгасу «Праўда» узялі на сябе абавязацельствы плян сяўбы збожжавых культур выканаць на працягу 12 дзён.

Прапоўныя аднасобнікі вёскі Лапічы абавязаліся раней тэрміну скончыць сяўбу і дапамагчы ворыву ў калгасе «Авангард».

Шырокае растлумачэньне адозвы ўдарнікаў каапэрацыі Рагачоўшчыны выклікала ўздым сацспаборніцтва серод паасобных калгасных брыгад. Старшы брыгадзір брыгады № 1 калгасу «Праўда» тав. **Жураўлёў** абавязаўся выканаць плян сяўбы аўса на 1 дзень раней тэрміну, ячменю — на тры дні, бульбы на 5 дзён раней вызначанага тэрміну. У сацдагаворы з брыгадамі прадугледжана адпусьціць ударнай брыгадзе № 1 тавараў на 300 руб. больш, чым іншым. Праўленьне ССТ абавязалася таксама арганізаваць абслугоўваньне калгасьнікаў гарбатай непасрэдна на полі.

Дзьве брыгады тут-жа, пасьля заключэньня сацдагавору, выехалі на ворыва.

Праўленьне сельспажыўтаварыства пастанавіла арганізаваць некалькі развозак і палявых ачагоў для абслугоўваньня калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Арганізаваны чырвоная і чорная дошкі лепшых і горшых калгасаў, вёсак, калгасьнікаў і аднаасобнікаў. Пасьля таго, як праўленьне ССТ паставіла абвясьціць таварны байкот вёскам Навасёлкі і Лейчыцы, занесеным на чорную дошку за дрэнную падрыхтоўку да сяўбы, рад працоўных аднаасобнікаў гэтых вёсак абяцалі прыняць усе меры, каб змыць з сябе ганебную пляму.

У часе заключэньня сацдагавораў з брыгадамі старшыня калгасу «Праўда»—Круглікаў выступіў з чыста-кулацкай прамовай: «Сацдагавары,—заявіў ён,—заключаюцца для таго, каб з калгасьнікаў як мага больш узяць, а тавараў ім не даваць». Брыгады рашуча асудзілі гэта выступленьне, як вылазку кулацкага агента, і ў адказ на яе абавязаліся павысіць класавую пільнасьць і па-бальшавіцку змагацца за правядзеньне сяўбы. Кулацкага агента Круглікава трэба зьняць з работы і выключыць з калгасу.

Брыгада «Зьвязды» —

Чавускі, Ваўкавіцкі.

ПЕРШЫЯ КРОКІ

ДРЫСА. ДРЫСЕНСКІ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ УКЛЮЧЫЎСЯ Ў КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА ПА АБСЛУГОЎВАНЬНІ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. ЕСЬЦЬ УЖО РАД ВЫНІКАЎ ПЕРАБУДОВЫ РАБОТЫ ССТ.—

ЗАКЛЮЧАНА 70 ДАГАВАРОЎ З БРЫГАДАМІ, КАЛГАСЬНІКАМІ І АДНААСОБНІКАМІ. У 37 КРАМАХ АРГАНІЗАВАНЫ ЧЫРВОНЫЯ І ЧОРНЫЯ ДОШКІ. ЛЕПШЫМ БРЫГАДАМ, КАЛГАСЬНІКАМ-УДАРНІКАМ І ПЕРАДАВЫМ АДНААСОБНІКАМ У РАХУНАК САЦДАГАВАРОЎ ПРАДАНА 200 ПАР БОТАЎ І ІНШ. ПРАМТАВАРЫ.

АРГАНІЗАВАНА 5 КАЛГАСНЫХ КРАМ, ЯКІМ АДПУШЧАНА МАНУФАКТУРА, ЦУКАР І НА 8.000 РУБ. ІНШЫХ ДЭФІЦЫТНЫХ ПРАМТАВАРАЎ.

ДЛЯ КАЛГАСНЫХ ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ АДПУШЧАНА 1.500 МЭТРАЎ МАНУФАКТУРЫ, 15 ЦЭНТН. ЦУКЕРАК І 750 КЛГ. ЦУКРУ. ДЛЯ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ КАЛГАСНЫХ СТАЛОВАК ВЫЗНАЧАНА 30 ТЭРМАСОЎ.

НА ЧОРНУЮ ДОШКУ ЗАНЕСЕН КАЛГАС «УСХОДНЯЯ ЗАРА», ЯКОМУ СПЫНЕН ВОДПУСК ТАВАРАЎ. 15 КРАСАВІКА Ў ПОЛЕ ВЫЕХАЛА 14 РАЗВОЗАК. РАЙСПАЖЫЎСАЮЗ І СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВЫ ПЕРАВЕДЗЕНЫ НА КРУГЛАСУТАЧНУЮ, БЕСЬПЕРАПЫННУЮ РАБОТУ.

В.

Аб загатоўчай рабоце спажыўкаапэрацыі і ОРСУ

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК прызнае загатоўчую работу ўсіх зьвеньняў спажыўкаапэрацыі зьнізу да верху нездавальняючай, што прывяло да простай пагрозы зрыву выкананьня раду адказьнейшых заданьняў па загатоўках (кантрактацыя ільну на 15 красавіка гэтага году — 14 проц., закупка збожжа на 15 красавіка — 11,8 проц., лён на 10 красавіка — 1,4 проц.).

ЦК асабліва адзначае зусім нецярпімыя чыноўніцка-раўнадушныя адносіны большасьці райспажыўсаюзаў, райзагаў, сельспажыўтаварыстваў і ЗРК да справы разгортваньня дэцэзагатовак і сельскага сьвіваадкорму для патрэб рабочага спажываньня: Магілеў, Ветка, Уваравічы, Парычы, Б.-Кашалёў, Карма, Старобін, Горкі.

Выходзячы з гэтага, ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Папярэдзіць прэзыдыум Белкаапсаюзу, дырэктароў загатоўчых аб'яднаньняў, кіраўнікоў раённых і сельскіх арганізацый, каапэрацыі, старшынь ЗРК, ОРС'аў і ЦРК, што ЦК будзе разглядаць далейшае пакіданьне загатоўчай работы ў такім становішчы, як простае ігнараваньне важнейшых заданьняў партыі.

ЦК патрабуе ад усіх работнікаў спажыўкаапэрацыі, у першую чаргу камуністаў, ліквідаваць такое ганебнае становішча і забясьпечыць бязумоўнае стопроцантнае выкананьне ўсіх заданьняў па загатоўках як цэнтралізаваных, так і дэцэнтралізаваных.

2. Прапанаваць Белкаапсаюзу і Упакамзаг СПА ўнесьці да 25 красавіка гэтага году на разгляд ЦК і СНК плян дэцэзагатовак у разрэзе раёнаў і важнейшых прадпрыемстваў, а таксама плян прымацаваных гарадоў і прадпрыемстваў да раёнаў.

Устанавіць такі парадак прымацаваньня пралетарскіх гарадоў і важнейшых прадпрыемстваў да раёнаў і сельспажыўтаварыстваў з тым, каб раённыя камітэты партыі, райспажыўсаюзы і сельспажыўтаварыствы несьлі-б поўную адказнасьць за выкананьне іх пляна дэцэзагатовак, як за важнейшую крыніцу забясьпячэньня рабочых, прымацаваных да іх прадпрыемстваў.

3. ЦК лічыць зусім шкоднымі і антыпартыйнымі наглядаючыяся ўтрыманскія настроі паасобных ЗРК і дырэктароў прадпрыемстваў аб немагчымасьці і малазначнасьці самазагатовак, што прывяло да рэзкага зьніжэньня дэцэнтралізаваных загатовак і тым самым да пагоршаньня рабочага спажываньня на радзе прадпрыемстваў. ЦК патрабуе ад ЗРК, ОРС'аў і дырэктароў прадпрыемстваў сапраўдных мер па асваеньні адведзеных для іх раёнаў, устанаўленьні доўгатэрміновых дагаворных узаемаадносін з сельспажыўтаварыствамі і калгасамі, даручаючы справу арганізацыі самазагатовак у раёнах не гандлярскім агентам і розным бязьдзейным элемантам, а энэргічным бальшавікам, па справе здольным арганізаваць па-баяўому самазагатоўкі і перамагаць коснасьць, бюракратызм і месьніцтва, што часта праяўляюць раённыя каапэрацыйныя арганізацыі і нават паасобныя кіруючыя партыйныя і савецкія работнікі ў раёнах.

4. Абавязаць гарадзкія камітэты КП(б)Б і прадпрыемствы ўстанавіць пастаянную жывую сувязь з партыйнымі арганізацыямі адведзеных для іх раёнаў, аказваючы дапамогу раёнам (работнікамі, вытворчай дапамогай калгасам і г. д.) у выкананьні пляну загатовак.

ЦК абавязвае сакратароў гаркомаў, старшынь гарсаветаў і гарпрафсаветаў асабіста сыстэматычна наведвацъ адведзеныя для іх раёны з мэтай практычнага вырашэньня на месцы з раённымі партыйнымі, савецкімі, калгаснымі арганізацыямі ўсіх пытаньняў, зьвязаных з разгортваньнем дэцэзагатовак і самазагатовак.

5. Райкомам КП(б)Б і Белкаапсаюзам неадкладна разгледзець пытаньне аб рабоце райзагаў пад пунктам погляду забясьпячэньня выкананьня гэтай пастановы ЦК, выгнаньня з апарату райзагу чужых і непрацаздольных элемэнтаў і ўкамплектаваньня райзагаў бальшавіцкімі і савецкімі добрасумленнымі кадрамі.

6. БКС і аддзелу кадраў перагледзець спэцыяльна пэрсанальны склад дырэктароў райзагаў з пункту погляду адпаведнасьці іх даручанай ім рабоце.

7. Абавязаць ГК, РК КП(б)Б, ЦСПСБ і БКС неадкладна праверыць становішча работы каапэрацыйных арганізацый і намеціць рад канкрэтных мер, выцякаючых з правядзеньня гэтай пастановы, дабіўшыся ў бліжэйшы час радыкальна палепшэньня рабочага снабжэньня і асабліва грамадзкага харчаваньня на прадпрыемствах.

Рэдактарам раённых газэт БССР

ВЫКЛЮЧНА ВЯЛІКУЮ РОЛЮ Ў СПРАВЕ МАБІЛІЗАЦЫІ ШЫРОКІХ МАС НА ЛЕПШАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫЯЙ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ЗАКЛІКАН АДЫГРАЦЬ АБВЕШЧАНЫ ГАЗЭТАЙ «ЗЬВЯЗДА», ПРЭЗЫДЫУМАМ БЕЛКААПСАЮЗУ І ЦП САЮЗУ РК І Г, КОНКУРС СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВАЎ НА ЛЕПШАЕ АБСЛУГОЎВАНЬНЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ.

УСЕ РАЁННЫЯ ГАЗЭТЫ БССР ПАВІННЫ НЕАДКЛАДНА АКТЫЎНА ЎКЛЮЧЫЦЦА Ў КОНКУРС.

МІЖ ТЫМ АДСУТНАСЬЦЬ Ў ЗНАЧНАЙ ЧАСТЦЫ РАЁННЫХ ГАЗЭТ МАТАР'ЯЛАЎ АБ ХОДЗЕ КОНКУРСУ І НАОГУЛ АБ РАБОЦЕ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ ПА АБСЛУГОЎВАНЬНІ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ ГАВОРЫЦЬ ЗА ТОЕ, ШТО ПЕРАВАЖНАЯ ЧАСТКА РАЁННЫХ ГАЗЭТ НЯ ТОЛЬКІ НЕ ЎЗНАЧАЛІЛІ РАБОТЫ ПА РАЗГОРТВАНЬНІ КОНКУРСУ НІЗАВЫМ ДРУКАМ, АЛЕ І САМІ НІЧОГА КАНКРЭТНАГА НЕ ЗРАБІЛІ ПА ЎКЛЮЧЭНЬНІ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ГЭТАЙ РАБОТЫ.

УЛІЧВАЮЧЫ ВАЖНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ГЭТАГА КОНКУРСУ, ВАМ НЕАБХОДНА ЗАРАЗ-ЖА Ў АДПАВЕДНАСЬЦІ З ТЫМІ ЗАДАЧАМІ, ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНЫ Ў ПЕРАДАВЫМ АРТЫКУЛЕ «ЗЬВЯЗДЫ» «РАБОТУ СПАЖЫЎКААПЭРАЦЫІ—НА СЛУЖБУ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ» (АД 9 КРАСАВІКА), УКЛЮЧЫЦЦА Ў КОНКУРС І РАЗГАРНУЦЬ НА СТАРОНКАХ РАЁННЫХ ГАЗЭТ І НІЗАВОГА ДРУКУ ПАКАЗ РАБОТЫ СЕЛЬСКАЙ КААПЭРАЦЫІ ПА АБСЛУГОЎВАНЬНІ ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б ЛЯЎКОЎ.

Заг. Сэктарам Друку Культпропу ЦК КП(б)Б КУРЦІК.

дапамог разбазарваньню, раскрадваньню сацыялістычнай уласнасьці. Да канца 1932 г. выяўлены страты гаспадаркі ў суме 167.000 руб. у той час, калі бухгальтар Тумілевіч склаў фіктыўны баланс з даходам за 1931 г. у суме 20.000 руб.

У калгасе «Новы сьвет» **Дрысенскага** раёну, фінансавы ўлік заблытан. Не разьмежаваны абавязкі паміж касірам і кладаўшчыком, з прычыны чаго пры праверцы касы выяўлена, што і кладаўшчык і касір трымаюць па руках больш чым на 1.000 руб. калгасных грошай, не здаючы іх у банк, у выніку зроблена растрата ў суме 1.550 руб.

У калгасах «Бальшавік» і імя 12 Кастрычніка, **Клімавіцкага** раёну, ў часе праверкі выяўлены нуныя злоўжываньні ў пастаноўцы ўліку сацыялістычнай маемасьці: не хапае 4.000 пудоў бульбы ў калгасе «Бальшавік», а ў калгасе імя 12-годзьдзя Кастрычніка незапрыходаваны 11.499 кгр. жыта, ячмянцы і аўса.

У калгасе «АСО» **(Жыткавіцкі** раён) рахункаводам аказаўся былы бандыт **Прас.**

На саўгасах «Весёлава» і «Палелюм», **Барысаўскага** раёну, фінансавы ўлік настолькі заблытан, што саўгас «Весёлава» ня ведае, каму ён павінен 12 тыс. руб. і хто яму павінен 18 тыс. руб. Няма апраўдальных дакумантаў. Не захоўваюцца элемэнтарныя правілы бухгалтарскага запісу.

У выніку такой пастаноўкі фінансавай работы на саўгасе «Палелюм» і МТС ячмяна заваччанасьць рабочым за 6 месяцаў на суму 75.000 рублёў.

Яснага мы павінны разгаць на такую работу кантрольна-рэвізійных камісій, яна даваў бліскучасьцю, сваёй лінай «ня хапае» і кіраўнікі сваіх падлеглых дагаворных разгаты, раскрадваньня грашей і маемасьці?

На 11-II—33 г. было 250 неразабраных спраў аб раскрадваньнях (**Чашнікі**).

Раённы пракурор т. **Лабоўскі** з 14-VI—32 г. не разглядаў спраў аб шкодніцтве, раскрадваньні сацыялістычнай маемасьці. Вярхоўны суд, якому накіраваны справы, таксама падыніць і не разглядае іх (**па Крычаве**).

У Шклоўскіх судовых органах набраліся 162 справы аб сабатажніках загатовак. Каб разгрузіць судовыя органы, РКК заклікала на дапамогу пазаштатных судзьдзяў.

Шклоўскія судовыя работнікі: судзьдзя т. **Шчаніл** і пракурор т. **Логінін** валынець з разглядам спраў аб раскрадваньні, расьцягваньні сацыялістычнай маемасьці.

Тав. **Сталін** у сваім дакладзе на студзеньскім пленуме ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб «выніках пяцігодкі за чатыры гады ў галіне барацьбы з рэшткамі варожых элемэнтаў» з усёй вострасьцю падкрэсьлівае задачу барацьбы за ахову і ўмацаваньне грамадзкай уласнасьці. Усе вагары дыктатуры пралетарыяту павінны быць падначалены важнейшай задачы: даць сьмяротны бой разгромленаму класаваму ворагу, які паспрабуе рабіць замах на савецкі лад.

Закон ад 7 жніўня 1932 году зьяўляецца магутнай зброяй у руках рабочай клясы і працоўных, зброяй барацьбы супроць спроб паміраючых рэштак капіталістычных клясаў раскрадваць сацыялістычную маемасьць. Органы пралетарскай юстыцыі павінны апэрацыйна, хутка, выразна, метка біць клясавага ворага законам аб ахове сацыялістычнай уласнасьці.

Органы пралетарскай дыктатуры — суд — асабліва цяпер, у пасеўнай кампаніі, калі кулак і яго агентура ўсімі сіламі будуць стараціца сарваць веснавую сяўбу, органы пралетарскай клясавай юстыцыі павінны быць на варце, на службе ў бальшавіцкай сяўбе. А вестка-ж з месц пацьвярджаюць тое, што кулак у асобных раёнах, калгасах робіць усякія хітрыкі, манэўры, перафарбоўваецца, толькі-б перашкаджаць, шкодзіць, псаваць калгасную маемасьць.

* * *

У той-жа час, пры адпаведнай масавай рабоце, выяўляецца вялізарная колькасьць фактаў выкрыцьця зладзея і раскрадальніка зьнізу масай, якая вядзе барацьбу за сацыялістычную маемасьць.

Буда-Кашалёўская райКК склікала спэцыяльныя нарады рэвізійных камісій калгасаў, ССТ па пытаньні барацьбы з растратамі ў калгасах і каапэрацыйных арганізацыях. На нарадзе прысутнічала 43 чал. Удзельнікі нарады атрымалі цэлы рад канкрэтных указаньняў, як трэба наладзіць улік, кантроль сацыялістычнай маемасьці.

У Чырвона-Слабодзкім раёне ўцягнута грамадзкасьць (групы садзейнасьці) **ў барацьбу за сацыялістычную ўласнасьць.**

Пракуратура мае 18 груп садзейнасьці (14 у калгасах, 3 у саўгасах і 1 у МТС). У 1932 годзе пракуратурай і судом праведзена нарада з гэтымі групамі па пытаньні аб ахове сацыялістычнай уласнасьці. У лютым месяцы 1933 г. была праведзена ячэ адна нарада аб ролі груп садзейнасьці ў падрыхтоўцы да сяўбы і іх задачы па ахове калгаснай маемасьці.

У практычнай рабоце пракуратуры мае месца практыка дачы асобных заданьняў групам садзейнасьці аб стане гаспадаркі калгасаў і саўгасаў. Так, напрыклад, група садзейнасьці калгасу «Анзор» атрымала заданьне праверыць падрыхтоўку да сяўбы (стан інвэнтару, конскага пагалоўя, ахова насенных фондаў), прычым група атрымала канкрэтны пытальнік для работы.

З 18 груп — 7 груп працуюць вельмі актыўна (група калгасу «Чырвоны пагранічнік», «Анзор», саўгасу «Старчыцы» і інш.).

Гэтыя групы праяўляюць сваю ініцыятыву, сыгналізуюць пракуратуры аб панўных прарывах або недахопах у гаспадарцы калгасаў: напрыклад, дзякуючы сыгналізацыі групы садзейнасьці, пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па калгасе «Анзор» (пакража калёс); па саўгасе «Боркі-Бялевічы» узбуджана судовая справа аб пакражы гароху; па калгасу «Чырвоны пагранічнік» узбуджана справа аб раскрадваньні аўса і дрэнная ахове інвэнтару і г. д.

У тым-жа раёне, у калгасе «Шлях Леніна», маем узор добрай пастаноўкі ўліку.

Улік па малочнай фэрме, якая зьяўляецца асноўным відам вытворчасьці данага калгасу (141 карова, 120 шт. маладняка) **пастаўлен узорна.**

Сыстэма ўліку малочнай прадукцыі пабудавана так, што хоць улік гэты праходзіць праз канцылярыю, аднак, жывёлавод, які загадвае выдачай і продажам малака, нясе поўную адказнасьць, дае справаздачу кожны месяц.

Удой, выдача, пераапрацоўка і продаж малака дакладна афармляюцца ведамасьцямі, актамі і расьпіскамі. Стаповучым моментам зьяўляецца паўнасьць упутранога і ўваемнага кантролю ўнутры самой фэрмы, так, напрыклад, загадчык фэрмай вядзе штодзённы ўлік удою малака на ведамасьці.

Як добры прыклад **вядучай ролі ячэйкі ў барацьбе за сацыялістычную ўласнасьць можна прывесьці ячэйку калгасу імя Вейкава** (яч. сельсавету), **Чырвона-Слабодзкага раёну.**

Дзякуючы апэрацыйнаму кіраўніцтву з боку ячэйкі, калгас падрыхтаваўся да сяўбы: парт'ячэйка ў сваёй штодзённай практычнай рабоце, у барацьбе за сацыялістычную ўласнасьць не абмяжоўваецца заслуховаваньнем дакладаў агульнага характару, а ставіла, вырашала канкрэтныя вытворчыя заданьні. Напрыклад, было ўстаноўлена пастаяннае дзяжурства камуністаў і камсамольцаў па праверцы начной аховы, выкрыта раскрадваньне насеньня былым паліцэйскім. Ячэйка выкрыла кулацкую арганізацыю, якая вяла падрыўную работу па разбурэньні калгасу.

На даных канкрэтных прыкладах бальшавіцкай барацьбы за ахову сацыялістычнай уласнасьці адстаючыя арганізацыі павінны выхоўваць масы, уцягваць іх у штодзённую барацьбу супроць ворагаў сацыялізму — зладзеяў, жулікаў, кулакоў.

Побач з жорсткімі мерамі ў адносінах да раскрадальнікаў — зладзеяў сацыялістычнай уласнасьці, побач з далейшым умацаваньнем дыктатуры пралетарыяту ў другой пяцігодцы, выходзячы з пастаноў XVII партыйнай канфэрэнцыі, разгортваецца і другі бок дыктатуры пралетарыяту: **выхаваўчы бок.** Стварэньне новай грамадзкай дысцыпліны, новага віду грамадзкай сувязі — важнейшая задача. Выхоўваць сацыялістычныя адносіны да грамадзкай уласнасьці — задача вялізарнай важнасьці.

Асабліва значэньне мае перавыхаваньне калгасьнікаў у работніку сацыялістычнага земляробства, перавыхаваньне учарашняга дробнага ўласьніка, які мае рад перажытку, у духу сацыялістычных адносін да грамадзкай уласнасьці.

Мы не павінны забываць, што сьвядомасьць людзей адстае ў сваім разьвіцьці ад фактычнага іх становішча. Калгасьнікі па становішчы ўжо не аднаасобнікі, а калектывісты, але сьвядомасьць у іх пакуль што ячэ старая, прыватна - уласьніцкая (**Сталін**).

Клас выкарыстоўвае прыватна-уласьніцкія навыкі і перажыткі ўчарашніх аднаасобнікаў — сёньняшніх калгасьнікаў для раскрадваньня і зладзейства. Гэта становішча мы павінны ўлічыць.

Надзвычай вялікая, ганаровая, удзячная і адказная работа ў сваячасовым вылаўліваньні зладзеяў сацыялістычнай уласнасьці ўскладаецца на органы КК-РСІ.

Тут трэба проста сказаць: бяз мае органы КК-РСІ ня справяцца са сваёй задачай вылаўліваньня раскрадальнікаў грамадзкай маемасьці. Рашаючая роля ў барацьбе з ворагамі сацыялістычнай уласнасьці ў рабоце органаў КК-РСІ на

СТАНОВІШЧА НА КУЧ

Паведамленьне ТАСС

Таварыш старшыні праўленьня КУЧ тав. КУЗЬНЯЦОЎ атрымаў ад старшыні праўленьня дарогі п. Лі Шао-гена 12-IV і 18-IV г. г. два лісты ў сувязі са становішчам, якое стварылася на ст. Манчжурыя.

У сваім першым лісьце п. Лі Шао-ген сьцьвярджае, што Ўсурыйская чыгунка нібыта пазычыла ў КУЧ вялікую колькасьць вагонаў і настойвае на хутчэйшым іх звароце, а таксама на звароце на КУЧ паравозаў-дзиаподаў, што перай шлі на савецкую тэрыторыю.

У другім лісьце п. Лі Шао-ген заяўляе, што гвалтоўныя дзеяньні манчжурскіх улад на ст. Манчжурыя, закрыцьцё стрэлак, якія злучаюць лініі КУЧ з Забайкальскай чыгункай, забарона простых зносін і транзіту і г. д. праведзены па распараджэньні міністэрства шляхоў зносін для аховы маемасьці дарогі і прыпыненьня простых бесьперагрузачных зносін.

Што датычыць цягнікоў міжнародных зносін, дык п. Лі Шао-ген заяўляе, што ніякіх перашкод гэтым зносінам ня робіцца і што ня было ніякіх намераў затрудняць гэтыя зносіны.

На гэтыя лісты тав. КУЗЬНЯЦОЎ 20-IV г. г. даў п. Лі Шао-гену адказ, у якім тав. Кузьняцоў указвае, што ў атрыманых ім ад Лі Шао-гена лістох ад 12-IV і 18-IV ён не знайшоў адказу на свой папярэдні ліст ад 10-IV, здрасаваны п. Лі Шао-гену, у якім тав. Кузьняцоў заявіў рашучы пратэст супроць гвалтоўных дзеяньняў чыгуначнай паліцыі на ст. Манчжурыя і вычарпальна растлумачыў на аснове існуючых дагавораў правы Савецкага саюзу на простыя і транзітныя перавозкі па КУЧ. Тав. Кузьняцоў у лісьце ад 10-IV патрабаваў таксама прыняцьця мер да неадкладнага скасаваньня ўсіх незаконных дзеяньняў і распараджэньняў, а таксама паведамленьня яго, калі пачнуцца прапанаваныя міністэрствам шляхоў зносін манчжурскага ўраду перагаворы аб заключэньні спэцыяльнай згоды аб простых зносінах паміж КУЧ і дарогамі СССР.

Тав. Кузьняцоў указвае, што ён спадзяецца атрымаць па закранутых ім пытаньнях хуткі адказ.

Далэй тав. Кузьняцоў піша: «Лічу неабходным растлумачыць наступнае: перш за ўсё трэба адзначыць, што сьцьвярджэньне ў вашым лісьце, што «КУЧ—сумеснае прадпрыемства дзьвёх дзяржаў», зьмешвае пытаньне аб уласнасьці з пытаньнем кіраваньня. Як вам вядома, КУЧ ёсьць уласнасьць СССР і тольки сумесна кіруецца».

Закранаючы пытаньне аб простых між народных эўрапэйска-азіяцкіх зносінах, тав. Кузьняцоў піша: «З тэлефонаграм кіраўніка дарогі Рудага вам вядома, што кіраўніцтва дарогаю надзвычай устрывожана тым, што 7-IV начальнік пагранічнага паліцэйскага атраду на станцыі Манчжурыя пісьмова паведаміў начальніку станцыі, што, з прычыны распараджэньня манчжурскага ўраду, спыняюцца простыя грузавыя зносіны ў абудва бакі да вырашэньня пытаньня паміж урадамі. Затым на стрэлкі навешваюцца замкі з папярэджаньнем, што пры спроба зьняць іх, ці прасунуць вагоны на Забайкальскую чыгунку будзе ўжыта сіла, прычым затрыманыя грузы перагружацца не павінны да распараджэньня ўраду, і вагоны, якія прыбываюць з Забайкальскай чыгункі на ст. Манчжурыя пасьля выгрузкі назад выпускацца ня будуць. На гэта я спэцыяльна зьвярнуў вашу ўвагу лістом ад 10-IV і да гэтага часу невядома аб скасаваньні гэтага распараджэньня паліцэйскімі ўладамі, якія дзейнічаюць, як яны спасылаюцца, на аснове распараджэньня міністэрства шляхоў зносін.

Кіраўніцтва дарогі, маючы на ўвазе гэтыя перашкоды, якія робяцца мясцовымі ўладамі, тэлефанаграмай ад 8-IV гэтага году, запыталася нашых указаньняў, папярэджваючы, што яно запытана радам дарог — удзельніц эўрапэйска-азіяцкіх зносін аб магчымасьці карыстацца паслугамі КУЧ па перавозцы грузаў у простых эўрапэйска-азіяцкіх зносінах.

Кіраўніцтва дарогі, лічачыся з інтарэсамі КУЧ і ўважліва адносячыся да інтарэсаў дзяржавы, да сучаснага моманту чакае зьняцьця перашкод на ст. Манчжурыя і паведамленьня аб гэтым.

Як вядома, кіраўніцтва да гэтага часу гэтага паведамленьня яшчэ не атрымала і, ня гледзячы на яго абавязак, неадкладна адказаць на запытаньне ўдзельніц эўрапэйска-азіяцкіх зносін, устрымалася ад такога паведамленьня, чакаючы нашых з вамі мерапрыемстваў і адказу.

Установамі, якія перашкаджаюць простым эўрапэйска-азіяцкім зносінам, зьяўляюцца ўлады Манчжоу-Го і, у прыватнасьці, тыя прадстаўнікі міністэрства шляхоў зносін, па ўказаньнях якіх паліцэйскія ўлады на ст. Манчжурыя правялі незаконныя мерапрыемствы, што парушаюць інтарэсы як КУЧ, так і дарог — удзельніц эўрапэйска - азіяцкіх зносін.

Спадзяюся, што ў мэтах недапушчэньня парушэньняў абавязацельстваў КУЧ вы даб'яцеся патрэбнага распараджэньня ўладамі на ст. Манчжурыя аб зьнішчэньні чынімых імі беззаконьняў і афіцыяльнага паведамленьня імі тых-жа асоб, якіх яны загадзя паставілі ў вядомасьць аб увядзеньні ўказаных мер, што дасьць магчымасьць кіраўніцтву дарогі паведаміць удзельніц аб працягваньні простых зносін».

Выпажыўшы вядомы пункт погляду савецкага ўраду па пытаньні аб вагонах і паравозах, які прыведзен у заяве нам. наркома замежных спраў т. Карахана японскаму паслу ў Маскве п. Ота і ў лісьце генэральнага консула СССР у Харбіне тав. Славуцкага дыплёматычнаму агенту манчжурскага ўраду, тав. Кузьняцоў указвае далей, што пад выглядам абароны маемасных праў КУЧ манчжурскія ўлады правялі рад гвалтоўных дзеяньняў, якія перш за ўсё накіраваны да падрыву нармальнай работы КУЧ і нанесьлі сур'ёзную шкоду інтарэсам СССР і што манчжурская частка кіраўніцтва КУЧ не прыняла мер да забесьпячэньня інтарэсаў дарогі, да спыненьня псаваньня вялізарнай колькасьці рухомага саставу ў выніку аварый на ўсходняй лініі КУЧ, да звароту захвачанай ад КУЧ перавалачнай прыстані, да аховы асабістай і маемасной бясьпечнасьці рабочых і служачых і г. д.

У заключэньне тав. Кузьняцоў выказвае надзею, што Лі Шао-ген зробіць належныя крокі да ўрэгуляваньня ўзьнятых пытаньняў і даб'ецца распараджэньня ўладам на ст. Манчжурыя не рабіць перашкод рабоце дарогі ў яе ўдзеле ў эўрапэйска-азіяцкіх зносінах і закойнаму скарыстаньню КУЧ у транзітных перавозках паміж дарогамі СССР, а таксама да стварэньня неабходных умоў для нармальнай работы КУЧ.

Тав. Кузьняцоў падкрэсьлівае, што савецкія прадстаўнікі на КУЧ зацікаўлены ў нармальнай рабоце КУЧ, якая давала-б найлепшы эфэкт для абодвых бакоў, на аснове дакладнага выкананьня адпаведных згод і палажэньняў аб КУЧ.

Фінансавая барацьба паміж Англіяй і ПАЗШ

ЛЁНДАН, 22. (Белта). Даляр у адносінах да фунта зноў зьнізіўся і катываўся ў 3,83 даляра за фунт, потым узьняўся да 3,85. У колах Сіці ў сувязі з гэтым трывога. Зьніжэньне даляра лічаць пачаткам націску амерыканскіх экспартэраў на сусьветныя рынкі.

Вялікую цікавасьць выклікалі суадносіны паміж курсамі фунта і франка. На працягу дня курс фунта павысіўся ў адносінах да франка з 87,5 фр. да 89,5 фр. за 1 фунт. «Гэта зьвязваюць з чуткамі аб намеры Францыі таксама адмовіцца ад залатога стандарту. Як паведамляе «Дэйлі Геральд», ангельскі банк прыступіў да буйнай игры на зьніжэньне франка і ў выніку гэтага набыў новую партыю золата на суму 1.631 тыс. фунтаў.

Аблігацыі германскіх пазык значна ўпалі. Паводле слоў **«Майнэн Шызэл-Таймс»** гэта тлумачыцца «продажам аблігацый з прычыны небясьпекі банкруцтва Германіі». Такім чынам, становішча міжнародных валют стварае вялікую нагрозу Брытанскаму гандлю і ўзьнікаюць апасеньні, што значэньне пратэкцыяністкіх мытных збораў буде зведзена на нуль.

Макданальд выдаў у Вашынгтоне пасланьне, у якім заяўляе, што ён, не адчуў расчараваньня, даведаўшыся, што ПАЗШ адмовіліся ад залатога стандарту», і ўказвае, што палітыка контрмераў была-б варыянтам.

„Адыход ад залатога стандарту--акт банкруцтва"

Н'Ю-ЁРК, 22 (Белта). Курсы акцый і цэны на тавары пачалі падымацца. Раздробныя цэны на хлеб, цукар, масла і інш. пазначна падымаюцца ў сувязі з чаканьнем інфляцыі. У газэтах паведамляюць аб пачатку захоўваньня харчоў. Тымчасам чыгуначныя кампаніі паведамляюць аб намеры зьнізіць у чэрвені на 25 проц. зарплату 100 тысячам рабочых. Масьнікі антрацытавых капальняў дабіваюцца зьніжэньня зарплаты гарнякам на 35 проц.

«Н'ю-Ёрк Івнінг Пост», указваючы, што сучасны крызіс становіць сабою кульмінацыйны пункт доўгага працэсу, піша: «Фактычна апошнія часы сьведчаць, што ўрад ня будзе працягваць кантраляваць інфляцыю. Пашыраецца палітыка кончыцца толькі тады, калі амэрыканская публіка зразуме, што ліквідацыя абавязаньняў адначасна рэквізіт ПАЗШ. Адыход ад залатога стандарту—акт банкруцтва і нацыянальнага нанчасьця».

Ліквідацыя германскай сацыял-дэмакратыі

БЭРЛІН, 22. (Белта). Як паведамляюць з **Мюнхену**, рад сацыял-дэмакратычных арганізацый у **Баварыі** ўжо прыступіў да самаліквідацыі. Рашэньне аб самароспуску прынята сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі ў **Рэйхенгале** і ў **Фрыдбэргу**. У Фрыдбэргу кіраўніцтва самаліквідаванай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі заклікае сваіх членаў падтрымліваць на цыянал-сацыялістскую фракцыю муніцыпалітэту.

Паўпрэд СССР у Кітаі тав. Багамолаў прыбыў у Шанхай

ШАНХАЙ, 23. (Белта). Сёньня ў Шанхай прыбыў паўнамоцны прадстаўнік СССР **БАГАМОЛАЎ** разам з работнікамі паўпрэдзтва. На параходзе Багамолава сустракалі прадстаўнікі міністэрства замежных спраў Нанкінскага ўраду, кітайскага муніцыпалітэту і савецкай калёніі ў Шанхаі. Яшчэ за гадзіну да прыезду тав. Багамолава на прыстані сабралася некалькі сот кітайскіх студэнтаў, моладзі і рабочых з плякатамі.

Прысутныя сустрэлі т. Багамолава шумнымі прывітаньнямі, апладысмэнтамі і кветкамі. Увесь пэрсанал савецкага паўпрэдзтва часова спыніўся ў Шанхаі.



Наступленьне японскіх войск у напрамку Бэйпіна

ШАНХАЙ, 23. (Белта). Згодна кітайскім паведамленьням, апошнія два дні японскія войскі вядуць упартыя атакі за **Нянцянмін**, на поўдзень ад Губейкоў, дзе размешчана 17-ая армія Суп Тынь-яо. Атакі адбітыя. 29-я армія Суп Чжэ-юаня адбівае часткова японскія атакі ў раёне **Саньхэцяо** і **Нантуньцін**. На сьценах **Бэйпіна** ўста поўлена зэнітная артылерыя. Створана сетка наглядальных авіяпунктаў у радыусе 9 міль для адбіцьця паветраных атак.

* * *

ЛЁНДАН, 22. (Белта). Газэты паведамляюць, што ў паўночным Кітаі ідзе падрыхтоўка на стварэньню марыянэтачнай дзяржавы пад назвай **Хобей-Го** і што кітайскія рэпэгаты маюць намер у бліжэйшы час пры падтрыманьні японскіх войск захапіць Бэйпін-Цяньцзінскі раён.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Да першага мая—з новымі перамогамі

Прыезд дэлегацый

Першамайская камісія запрошаны на сьвята ў Менск рабочыя дэлегацыі з МАСКВЫ, ЛЕНІНГРАДУ, ХАРКАВУ І СМАЛЕНСКУ.

Акрамя таго, у Менск для ўдзелу ў першамайскім сьвяце прыедуць дэлегацыі з Гомелю, Віцебску, паасобных МТС, калгасаў і саўгасаў.

З БССР на першамайскія ўрачыстасьці выедзе ў Маскву дэлегацыя з пяці чалавек. У склад яе ўвойдуць прадстаўнікі заводаў: імя Варашылава, «Бальшавік» (Менск), заводу імя Ланцуцкага (Гомель), фанэрнага заводу (Віцебск) і шаўковай фабрыкі (Магілёў).

Фабрыкі і заводы рыхтуюцца

Прадпрыемствы швэйнай прамысловасьці БССР разгарнулі масавую работу па падрыхтоўцы да першамайскага сьвята і 4-ай гадавіны сацспаборніцтва.

Брыгада імя МОПР'у фабрыкі «Кастрычнік» з посьпехам змагаецца за выкананьне красавіцкага прамфінпляну на 105 проц. Гэта брыгада выклікала на сацспаборніцтва ўсе цэхі фабрыкі і зьвярнулася да рабочых швэйнай прамысловасьці з лістом, у якім заклікае змагацца за датэрміновае выкананьне прамфінпляну.

На фабрыцы абвешчан конкурс на лепшага ўдарніка. Для прэміяваньня ўдарнікаў асыгнавана 5.000 рублёў. (БЕЛТА).

Новыя культурна-бытавыя ўстановы

Кіраўніцтва ўлаўнаважанага наркамату цяжкай прамысловасьці адзначае першамайскае сьвята сканчэньнем раду дамоў для рабочых і адкрыцьцём новых культурна-бытавых устаноў.

На АСІНТОРФЕ здаюцца ў эксплёатацыю 5 жылых 4-кватэрных дамоў, адзін стандартны дом з 12 пакояў, два баракі для інтэрнату і сталоўка.

На торфзаводах «Чырвоны сьцяг», імя Даўмана, «Чырвоная Беларусь», імя 1-га мая, «Бальшавік» канчаецца 12 баракаў для інтэрнатаў, 4 пазьні, 2 жылыя 4-кватэрныя дамы і 11 стандартных дамоў.

Паравозы і вагоны звыш пляну

Рабочыя Жлобінскага дэпо да першамайскага сьвята выпускаюць два паравозы з халоднай прамыўкі і адзін паравоз з капітальнага рамонту звыш пляну. Вагонныя выпускаюць 30 вагонаў з вялікага рамонту.

Дэпо Магілёў да 1-га мая выпускае два паравозы з халоднай прамыўкі, рамантуецца 15 вагонаў.

Рабочыя 32-й дыстанцыі шляху (Магілёў) у адзнаку першамайскага сьвята ў выхадныя дні зменяць адзін кілёмэтр рэек.

У кавальскім цэху жлобінскіх майстэрань арганізавалася новая ўдарная брыгада імя **Першага мая**. Брыгада абавязалася зьнізіць сабекошт прадукцыі на 5 проц., запоўніць свой рабочы дзень, павесьці рашучую барацьбу з лодырамі, гультаямі, бракаробамі, рвачамі, і выклікала насьледаваць яе прыкладу сталярную і сьлясарную брыгады.

У Віцебскім дэпо разгортваецца конкурс, які ставіць сабе мэтай замацаваць дасягненьні 3-га ўсесаюзнага конкурсу. Для прэміяваньня лепшых брыгад ударнікаў вызначана 3.000 рублёў.

Брыгада столяраў па бягучым рамонце (Гомельскае дэпо) абавязалася перавыканаць красавіцкае заданьне на 12 проц. і звыш пляну адрамантаваць два таварныя вагоны.

24 красавіка—дзень чыстаты на транспарце

Сёньня на транспарце дзень чыстаты. Яго задача—прывесьці ў поўны парадак вакзалы, дэпо, станцыі, ачысьціць ад бруду і сьмецьця.

У Менску на пасажырскім вакзале вылучана спэцыяльная брыгада, якая праводзіць рад мерапрыемстваў па аздараўленьні санітарнага становішча вакзалу.

На таварнай станцыі праведзена некалькі суботнікаў па ачыстцы яе ад рознага сьмецьця і балясту.

Культываваньне вінаграду ў БССР

Наркамзем уключае у план работы запальнай дасьледчай плодаягоднай станцыі дасьледваньне і вывучэньне магчымасьці культываваньня ва ўмовах БССР прамысловай культуры вінаграду.

З гэтай мэтай станцыя закладае дасьледчы вінаградник, у якім будуць сабраны ўсе віды і гатункі вінаграду, якія ўжо культывуюцца ў БССР (Рагачоў, Слуцак, Прапойск), мічурынскія гатункі, якія адзначаюцца больш высокай халодастойкасьцю, і розныя формы дзікарастучых лоз вінаграду. (Белта).

ХРОНІКА

У сувязі з гадавінай пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка 1932 г. пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый, аргкамітэт Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР і рэдакцыя газэты «Літаратура і мастацтва» мяркуюць пра весьці наступныя мерапрыемствы:

★ Рэдакцыя газэты «Літаратура і мастацтва» прысьвяціла спэцыяльны нумар да гадавіны. У нумары зьмяшчаюцца—артыкул старшыні аргкамітэту ССПБ тав. Клімковіча аб значэньні гада віны пастановы ЦК УсеКП(б) і водгукі пісьменьнікаў: Купалы, Коласа, Аляксандровіча, Бядулі, Чорнага, Гурскага, ударніка, заклікананага ў літаратуру, Гурэвіча і навуковага работніка інстытуту літаратуры і мастацтва БАН тав. А. Усса.



Панчошна-трыкатажны камбінат «КИМ» у Віцебску.

Выдача пашпартаў

За 22 красавіка выдана на Менску 1.495 пашпартаў, а з пачатку пашпартызацыі 18.250. Працуе 15 пунктаў, у тым ліку 7 агульна-гарадзкіх.

Павялічваецца завоз газы

Існуючая сетка нафтахаванальнікаў і колькасьць тары не забясьпечваюць значнага росту гадавога пляну завозу газы ў БССР.

Выходзячы з гэтага, СНК пастанавіў пашырыць сетку нафтахаванальнікаў і не дапускаць у 1933 годзе на 1996 тон. Затвердзіцца таксама адпаведная мода кавасьць тары. (БЕЛТА).

Усім раённым першамайскім камісіям, райкомам КП(б)Б, прадпрыемствам, установам, калгасам саўгасам, МТС і рэдакцыям газэт

26 красавіка а 10 гадзіне ўвечары адбудзецца ўсебеларуская радыё-нарада пад старшынствам тав. Ляўкова (ЦК КП(б)Б) па пытаньні падрыхтоўкі да правядзеньня 1-га мая. З інфармацыйнымі дакладамі выступяць старшыні першамайскіх камісій. Заключная прамова сакратара ЦК КП(б)Б т. Шаранговіча. У нарадзе прымаюць удзел наступныя гарады і раёны: Жлобін, Рэчыца, Мсьціслаўе, Гарадок, Горкі, Заслаўе, Менск, Чачэрск.

Яўка членаў раённых першамайскіх камісій на радыёвузел абавязкова. Арганізуйце слуханьне радыёнарады першамайскімі камісіямі прадпрыемстваў, калгасаў. У часе нарады абгаварце пра пазновы і заўвагі з мэтай лепшай падрыхтоўкі да сьвята, прыстасаваўшы да вашых умоў.

Абавязваем усе газэты і шматтыражкі надрукаваць гэту абвестку з мэтай шырокага паведамленьня ўсіх прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і МТС, штодзенна асьвятляючы ў друку.

Першамайская камісія ЦК КП(б)Б.

Інструкцыя Наркампрацы і Наркамзему Саюзу ССР ад 17 сакавіка 1933 г. аб парадку адыходніцтва з калгасаў

1. Калі калгасьнік пашоў на работу па дагаворы з гаспадарчым органам да атрыманьня на месцы закону 3-га сакавіка 1933 г. аб парадку адыходніцтва з калгасаў, дык ён абавязан не пазьней 15 чэрвеня 1933 г. даць праўленьню калгасу даведку ад прадпрыемства, дзе ён працуе.

ЗАЎВАГА: Па сканчэньні тэрміну дагавору з прадпрыемствам калгасьнік можа аднавіць дагавор на новы тэрмін, аб чым таксама даецца даведка праўленьню калгасу.

2. У даведцы павінны быць указаны:

А) Прозьвішча, імя і імя на бацьку калгасьніка;

В) назва і месцазнаходжаньне прадпрыемства, дзе ён працуе;

В) Указаньне спэцыяльнасьці, па якой ён працуе;

Г) тэрмін, на які заключан дагавор.

3. Даведку пасылае калгасьнік па пошце заказным лістом.

4. Праўленьне калгасу абавязана даведку зарэгістраваць, і ня мае права адклікаць калгасьніка з работы на прадпрыемстве.

5. У далейшым калгасьнікі, якія адыходзяць на работу, абавязаны перад адыходам прадставіць дагавор з прадпрыемствам у праўленьне калгасу для рэгістрацыі.

6. Праўленьне калгасу абавязана зарэгістраваць дагавор у трохдзенны тэрмін.

7. Рэгістрацыя ў праўленьні калгасу даведак ад прадпрыемства (параграф 1-ы) і дагавораў (пар. 5-ы) робіцца спосабам запісу ў асобны спытак ці кнігу: а) прозьвішча, імя і імя на бацьку калгасьніка; б) назвы і месцазнаходжаньне прадпрыемства, дзе ён працуе, ці зьбіраецца працаваць; в) спэцыяльнасьці; г) тэрміну, на які заключан дагавор.

Пры гэтым на дагаворы, які прадстаўляецца для рэгістрацыі (пар. 5) робіцца надпіс: «зарэгістраван у праўленьні такога-та калгасу, такога-та числа», подпіс старшыні праўленьня і прыкладаецца пячатка калгасу ці сельсавету.

Народны Камісар Працы СССР А. ЦІХОН.

Нам. нар. кам. Зямляробства Саюзу ССР А. МУРАЛАЎ.

Паведамленьні

— Менгарком КП(б)Б паведамляе, што 25-та красавіка г. г., у 7 гадз. вех., у памяшканьні Дому Камасьветы (ўваход з вул. Карла Маркса) склікаецца нарада жанарганізатараў усіх ячэек КП(б)Б. У сувязі з важнасьцю пытаньня яўка ўсіх абавязкова.

— Агітмас Менгаркому КП(б)Б паведамляе ўсіх дакладчыкаў, вылучаных к першамайскім дням, што ў гаркоме КП(б)Б ёсьць дадатковы матар'ял для дакладчыкаў. Атрымаць можна штодзенна (будынак ЦК КП(б)Б, 2-гі паверх, 39-й пакой, у т. Левінай).

Агітмас гаркому КП(б)Б.

Сёньня, роўна а 7 гадзіне увечары ў памяшканьні дому Камасьветы (клюб імя Карла Маркса) склікаецца нарада старшынь першамайскіх камісій, кіраўнікоў калён і арганізатараў самадзейнасьці ў калёнах усіх прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый гораду.

Менгарком КП(б)Б. Гарадзкая першамайская камісія.

— Камуністычны Універсытэт Журналістыкі імя **В. Вароўскага** ў Ленінградзе праводзіць асенні набор студэнтаў.

Беларусі прадстаўлена 10 месц. Заявы аб прыёме з адпаведнымі дакумэнтамі павінны быць накіраваны ў Культпроп ЦК КП(б)Б праз адпаведныя ГК і РК КП(б)Б.

Правілы прыёму дасланы ГК і РК КП(б)Б.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзярж. Тэатр (БДТ-I)
СЁНЬНЯ МОСТ
ПАЧАТАК у 8 гадз. веч.

Чырв. Зорка. Каса—ад 1 г. дня. Гукавы мастацк. кінораман выт. БЛК СЛАВА СЬВЕТУ

Дзіцячы гукавы кіно-тэатр. Каса з 1 г. дня. ГУКАВАЯ ПРАГРАМА 1. НЕВЕРОЯТНО, но факт 2. ПОШТА.

Інтэрнацыянал. Каса—ад 4 г. дня. ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ 1. ГОРАД ПАД ВАДОЙ 2. БОЙ і ЖЫЦЬЦЯ. ПОЛА ИЗГРЫ ў мастацк. фільме КАЛЮЧЫ РОТ

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" ПАТ І ПАТАШОН у камедыі ЗНАТНЫЯ падаром ніці

Кіно „СПАРТАК". Каса—з 2 г. 30 м. дня. Замежны фільм МАРАЛЬ камедыя ў 6 частках.

25 красавіка, у 7 гадз. веч., у клюбе імя Карла Маркса склікаецца ЗЬЛЁТ МОПРАУЦАУ г. Менску.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі 5 пленуму ЦК МОПР СССР і 6 пленуму ЦК МОПР БССР, дакл. Велошыя.
2. Падрыхтоўка да 1 мая і задачы Мопрарганізацыі—дакл. Баран.
Пасьля зьлёту—мастацкая частка.
Білеты выдае гарком МОПР'у.
Яўка сакратароў ячэек абавязкова. Гарком МОПР'у.

Усім заводам, фабрыкам і ўстановам. Гарснаб паведамляе, што выдача хлебна-прадуктовых картак на май будзе праводзіцца на 29 красавіка ўключна, а з 30 красавіка і па 8 мая ўключна павінны здаць остачу картак, а таксама представіць заяўкі на чэрвень месяц па тай-же форме, як і на май месяц.
УВАГА: Праца праводзіцца ад 9 гадзін і да 4-х гадзін.

ЦП ПРАЦМАСТАЦТВА
СКЛІКАЕ на 25 красавіка, у 1 гадз. дня, у памяшканьні 1-га Беларзяржтэатру агульна-гарадзкі СХОД працаўнікоў мастацтва
гор. Менску, прысьвечаны тэзісам пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23-IV—32 г. аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый,
)—(з парадкам дня:)—(
даклад дырэктара Інстытуту літаратуры і мастацтва БАН т. ВОЛЬСКАГА. аб становішчы літаратурнай і мастацкай справы ў БССР.
На сход запрашаюцца пісьменьнікі і літаратурныя работнікі:
Прэзыдыум ЦП саюзу Белпрацмастацтва.

ВАГА! УВАГА!
З 21 красавіка ў памяшканьні дзіцячага гукавога кіно-тэатру пачалі дэманстравацца ШТОДЗЕННА па 2 ВЯЧЭРНІХ кіно-сэансы (з 7 гадз. вечара)
палітасьветныя і навукова-тэхнічныя фільмы.
Арганізацыям па калектыўных заяўках—скідка 20 проц.

БЕЛШВЭЙТРЭСТ
даводзіць да ведама ўсіх працаўніковаў, якія падпісаліся на пазыку 3-га РАШАЮЧАГА ГОДУ 5-цігодкі, што яны павінны атрымаць свае аблігацыі (прад'явіўшы замацавальныя талёны) да 1 мая 1933 г.
—ШТОДЗЕННА з 9 да 3 з палов. г. дня.
Пасьля пазначанага тэрміну аблігацыі будуць зданы ў АШЧАДКАСУ для абязьлічнага хаваньня.
АДМІНІСТРАЦЫЯ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
СЭКТАР КНІГАГАНДЛЮ
ВЫЙШЛА З ДРУКУ І РАССЫЛАЕЦЦА ПАДПІСЧЫКАМ ЧАСОПІСЬ
„Камуністычнае Выхаваньне"
за 1933 год, № 2 (люты)
(Цана асобнага нумару 1 руб.).
Заканчваецца друкам часопісь „КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ" № 3—4 (сакавік—красавік)
Орган Наркамасьветы і ЦП саюзу Працасьветы БССР
ЗЬМЕСТ НУМАРУ 3-4
КАРЛ МАРКС як заснавальнік навуковага камунізму.
КАРЛ МАРКС (да 50-годзьдзя сьмерці). Тэзісы ІМЭЛ.
Акадэмік С. Я. ВАЛЬФСОН.—Карл Маркс аб сацыялістычным первыхаваньні мас.
Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму! (Перадавая газэты „Правда").
Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б у сувязі з артыкулам „Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам".
Розаліюцыя пленуму ЦК і Менскага гаркому КП(б)Б па пастанове ЦК ад 2-га сакавіка 1933 года.
В. РУДНІЦКІ і КАЗАКОЎ.—Вынікі першай пяцігодкі нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР.
В. ЗАЙЦАЎ і ГОЛУБ.—Ліквідаваць прарывы ў выкладаньні грамадазнаўчых дысцыплін.
Т. Я. ШЫЗКО—Аб чытаньні і разьвіцьці вусной мовы вучняў у 1-м канцэнтры.
Е. І. ГАРОДНІНА—Формы і мэтады работы з дзіцячай кнігай сярод школьнікаў.
Л. ШАШКОЎ—Якім ёсьць і якім павінен быць урок (працяг).
Г. САГАЛОВІЧ—Трапэцыя і ўдасьцівасьці яе эльементаў на заняткох па матэматыцы ў 8-й групе.
Л. М. КУНДА—Мэтадычная распрацоўка праграмы па с.-г. на весна вы пэрыяд 1932—1933 навуч году.
Удзел школы ў весьнавой пасэўкампаніі (інструкцыйна-мэтадычны ліст Рагачоўскага райАНА).
М. И. ЛАЗАРЭНКА—Аб мэтодыцы і арганізацыі практыкі студэнтаў с.-г. ВНУ і тэхнікумаў.
III. Пастановы і Інструкцыі НКА і ЦП саюзу працасьветы БССР.
ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1933 год ПРАЦЯГВАЕЦЦА
Падпіска прымаецца ўсімі райбюро, гарбюро і газэтнымі і кіёскамі Саюздруку.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На 12 месяцаў — 10 руб
6 „ — 5 „
3 „ — 2 руб. 50 кап.
УВАГА: Новая падпіска прымаецца толькі пачынаючы з сакавіцкага нумару (№ 3—4).
У аддзел аб'яў званецце па тэлефону 21-358

Рэдакцыя газ. „ЗЬВЯЗДА" 25 красавіка 1933 году а 7 гадзіне увечары склікае НАРАДУ па пытаньнях запазычанасьці па зарплаце і перавыдаткаваньні фондаў зарплаты.
На нараду запрашаюцца з адпаведнымі матар'ялами прадстаўнікі ад Наркампрацы Іозэф і Гольдберг, ЦП фінбанкаўскіх работнікаў Кайкоў, НК РСІ—Дагман, НКФ—Ліхаў, Беларзяржбанку — Шэрман, Белкамунбанку — Розэнгаўз, Прамбанку—Алейнікаў, Сацзэмбанку—Бушуеў, Дзяржпляну — Альперовіч, наркам Дзяпрому—Картыш-Блук, Наркамугасу—Балынец, Наркамлёгпрому—Айзэнсон, Наркамсхабу Лібэрман і Касьцевіч, Упаўнаркамлесу — Майскі, Упаўнаркамсаўгасаў—Мельнікоў, Лесбелу—Іовіч і Зельдовіч, Белторгу — Бабіцкі, Галоўдартрасу — Гофель, Белматалатрасту — Майзэльс, Белкурабгадняцтва — Гольдберг, Белкадсоюзу— евіт, Белшвэйтрэсту — Рубінштэйн.
Прадстаўнікі аб ЦСПСБ Наркамюсту і гарпрафсавету, а таксама дырэктары і рэдактары шматтыражак заводаў імя Варашылава, „Натунар", імя Мясьнікова, імя Молатава, „Бальшавік", шыўнай фабрыкі імя „Рупоснай", абутковай — „Кастрычнік" і канфэтавой — „Натунарка" і друкарні імя Сталіна.
Усе прадпісаныя таварышы павінны зьявіцца з адпаведнымі матар'ялямі. Нарада адбудзецца ў памяшканьні прамсэктару рэдакцыі, Савецкая, 63, 3 паверх.
РЭДАКЦЫЯ.

Паводле пастановы СНК СССР ад 9-3-1933 г., Клічаўскі лясны рабочы каапэратыў „ЛЕСРАБКОП" ліквідуецца з 1-IV-1933 г.
Прэтэнзіі прымаюцца ліквідкомам тольки да 1-V-1933 г., пасьля якога тэрміну ніякіх прэтэнзіі прымацца ня будуць.
Ліквідком.

СНАБАЎТАДОРУ БССР ПАТРЭБЕН ст. бухгальтар.
Зварачацца: Менск, Савецкая, 82, Снабаўтадор.

Усім камсодам!
СЁНЬНЯ у 6 гадз. вечара, у клюбе ХАРЧАВІКОЎ імя Сталіна (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай, 2-гі паверх, малая заля)
адбудзецца НАРАДА УСІХ КАМСОДАУ прадпрыемстваў і ўстаноў г. Менску.
Яўка ўсіх членаў камсодаў абавязкова.
Старшыня гаркамсоду КАРАНЕЎСКІ.

Глускае аддзяленьне Дзяржбанку
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ўсіх устаноў і арганізацый, што за неаплату пазык ПРАДАЕЦЦА наступная маемасьць Глускага лесправгасу:
жарабец-рысак, 5 год—1000 руб., жарабяты 1-гадовыя—4 шт. на 400 р., цялега на жал. ходу з рэсор. падушкай—300 р., колы пад жал. ход 10 шт.—100 руб., кабыліца, 7-гадов., рыс. арданн—1000 руб., Картатэка з 4-мя яшч. — 100 руб. машынка „Рэйль" -- 500 руб., гадзіньнік насьценны—100 руб., сталы канторск. на 400 руб., арыфмометры 2 шт. за 600 руб., шафа нескараемая—300 руб., шафы простыя на 400 руб.
Маемасьць прадаецца толькі сацыялістычнаму сэктару.
За ўсімі даведкамі зварачацца ў плянавую частку Глускага аддзяленьня Дзяржбанку.
ДЗЯРЖБАНК.

Сэктар кадраў ВОСУ арганізуе групу рахункаводаў для сыстэмы Белкааппрамсавету на раёне.
Стыпэндыя ад 40 да 80 руб. у месяц і квартэрныя 20 руб. у месяц, Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Заявы з дакумэнтамі аб сац. становішчы, аб адукацыі (ня ніжэй 6 гр.), аб узросьце (ня менш 17 год), а для калгасьнікаў—згоду праўленьня, прымаюцца ў канцылярыі ВОСУ (Менск, Камуністычная, 16, пакой № 10) да 6 мая, ад 12 да 2 гадзіны штодзенна.

ЦА ПАДСТАВЕ ЗАГАДУ НАРКАМСНАБУ БССР ад 15-III-33 г. за № 53, СМАЛЯВІЦКАЯ райконтора БЕЛПЛОДАГАРОДНІНЫ ЛІКВІДУЕЦЦА.
Просьба да ўсіх устаноў, арганізацый, сялян АТРЫМАЦЬ РАЗЛІКІ па ўсіх апрацыях да 30 красавіка